ЛІТАРАТУРА і мастацтва

ЛіМ

21 кастрычніка 2005 г. № 42/4329

АНОНС!

Да нядаўняга часу амаль усе значныя мастацкія цэнтры і выставачныя пляцоўкі нашай сталіцы мелі статус агульнанацыянальных, як Нацыянальны мастацкі музей, ці належалі грамадскім арганізацыям рэспубліканскага значэння, як Галерэя Беларускага саюза мастакоў... Больш за ўсё статусу гарадской адпавядае вядомая аматарам мастацтва галерэя "NOVA" пры Цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы, якая дзейнічае дзякуючы намаганням і ініцыятыве яе супрацоўнікаў. А два гады таму ў Мінску адбылася беспрэцэдэнтная падзея — расчыніла свае дзверы першая муніцыпальная галерэя — Гарадская мастацкая галерэя твораў Л. Шчамялёва. З яе дырэктарам — мастацтвазнаўцай Таццянай БЕМБЕЛЬ — наша гутарка.

СТАР. 5

Сённяшнія цацкі далёка не такія, якімі былі ў маё "савецкае" дзяцінства. На змену маўклівым пластмасавым салдацікам прыйшлі віртуальныя арміі, якія бездакорна выканаюць любы загад. З дапамогай камп'ютэрных гульняў з'явілася магчымасць пераносіцца праз час і прастору. Але што нясуць новыя магчымасці дзецям і дарослым, якія гуляюць у камп'ютэр не менш за сваіх дзяцей?

СТАР. 12

Сябры і партнёры

Святочная і ўрачыстая атмасфера панавала на мінулым тыдні ў Палацы Рэспублікі, дзе 13 кастрычніка праходзіла адкрыццё Дзён Маскоўскай вобласці ў нашай краіне. Перарэзаць пунсовую стужку пры прэзентацыі выстаўкі, якую ладзілі тут расіяне, было даручана Паўнамоцнаму прадстаўніку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — намесніку прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Васілю Даўгалёву і намесніку Старшыні Урада Маскоўскай вобласці Васілю Громаву. Як прагучала падчас знамянальнай для двух братніх народаў падзеі, Беларусь — буйнейшы, надзейны і стратэгічна важны партнёр гэтага суперразвітага рэгіёна, які па колькасці насельніцтва займае другое месца ў Расійскай Федэрацыі. У Падмаскоўі размешчана звыш сарака даследчых і навучальных інстытутаў Расійскай акадэміі навук, паўтары сотні галіновых навуковых устаноў, а таксама шмат прадпрыемстваў агульнарасійскага значэння, пры тым іх прамысловы патэнцыял унікальна стасуецца з добра развітым навукова-тэхнічным.

(Заканчэнне на стар. 2)

Фота К. ДРОБАВА
Калаж Віктара Калініна

Сябры і партнёры

(Працяг. Пачатак на стар. 1)

"Нашыя гандлёва-эканамічныя адносіны — яркі прыклад не толькі добрасуседства, але і пастаянна мацнеючага ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. Па выніках мінулага года аб'ём сумеснага тавараабароту склаў амаль мільярд долараў ЗША і прагледжваецца тэндэнцыя яго далейшага росту", — гаворыцца ў прывітанні губернатара Маскоўскай вобласці Барыса Громава ўдзельнікам і гасцям выставы-прэзентацыі. Хаця, зразумела, паказаць усе дасягненні расіян проста немагчыма. Але тое, што было прадстаўлена, уражвае і захапляе. І разумееш: у чымсьці мы ідзём поруч з гасцямі, а дзе-нідзе яны нас і апярэдзілі — што ж, ёсць магчымасць павучыцца.

Але і дзелавыя партнёры з Падмаскоўя шчыра зацікаўлены шмат якой прадукцыяй, якая вырабляецца ў Беларусі, і ведаюць, што яна — экалагічна чыстая. Менавіта таму Дням Маскоўскай вобласці ў Рэспубліцы Беларусь кіраўніцтва расійскага прысталічча, прадпрыемствы і фірмы, размешчаныя ў Падмаскоўі, надаюць вялікую ўвагу. І ёсць упэўненасць, што гэтае мастацкае мерапрыемства выведзе нашыя гандлёва-эканамічныя сувязі яшчэ на больш высокі ўзровень.

Толькі паспелі адкрыць выставу, а ўжо былі падпісаны розныя пагадненні, кантракты, дагаворы. "Спадзяюся, усё пералічанае стане пачаткам вялікага шляху ў нашых адносінах", — зазначыў Васіль Громаў, адказваючы на пытанні прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі.

— Наладжаная ў Мінску выстаўка-прэзентацыя вельмі патрэбная для пашырэння дзелавых сувязей паміж беларусамі і расіянамі і дазволіць яшчэ больш даведацца пра магчымасці Маскоўскай вобласці, паглядзець, як ідуць справы ў сяброў, — зазначыў Васіль Даўгалёў. — Аб'ём, выпускаемай у гэтым рэгіёне прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі параўнальны з тым, што вырабляе ўся Беларусь. А па будаўніцтве жылля гэты рэгіён апярэдзіў ужо і Маскву, што цягне за сабою і вытворчасць, і патрэбу ў таварах, і паляпшэнне ўзроўню жыцця людзей.

Удзельнікі прэзентацыі не маглі не спыніцца каля стэндаў прадстаўнікоў Протвіна — горада навукі, адукацыі, высокіх тэхналогій, які мае важкія падставы для атрымання статуса навукаграда Расіі. Уся яго гісторыя звязана са стварэннем і развіццём унікальнай навукова-эксперыментальнай базы паскаральнай тэхнікі, якая дазваляе праводзіць на сусветным узроўні даследаванні ў сферы фізікі высокіх энергій.

Як вядома, Маскоўская вобласць яшчэ і адзін з буйнейшых гістарычных і культурных рэгіёнаў Расіі. Тут размешчаны старадаўнія гарады: Серпухаў, Мажайск, Каломна, Звенігарад, знакамітыя цэнтры праваслаўя: Троіца-Сергіева лаўра, Уваскрасенскі Новаіерусалімскі манастыр. Падмаскоўе можа пахваліцца шматлікімі памятнымі месцамі, якія звязаны з жыццём і дзейнасцю Аляксандра Пушкіна, Фёдара Цютчава, Пятра Чайкоўскага... Міністэрства культуры Маскоўскай вобласці праводзіць вялікую работу, каб захаваць усё гэтае багацце для будучых пакаленняў. Пацвярджэнне таму — выстава ў Палацы Рэспублікі.

Сярод вядомых усяму свету унікальных вырабаў, якія прынеслі славу Расіі, асобае месца займаюць хусткі і шалі са старадаўняга горада Паўлаўскі Пасад. Аб іх высокай мастацкай і культурнай каштоўнасці сведчыць тое, што Паўлавапасадская хустачная мануфактура аднесена да прадпрыемстваў народных мастацкіх промыслаў Расіі. Штогод тут выпускаецца 200 відаў рознай прадукцыі з воўны, шоўку, бавоўны, якая, здаецца, ніколі не выходзіла з моды і заўсёды глядзіцца сучасна. У нашай краіне падобнай вытворчасці не існуе. Так што застаецца толькі вывучыць попыт і заключыць з расіянамі адпаведную дамову.

А ў праваслаўным сэрцы Расіі (непадалёку ад г. Сергіеў Пасад) стаіць вёска Багародскае, радзіма цудоўнага народнага промыслу, — разной драўлянай цацкі і скульптуры. Прама на вачах прысутных майстар выразаў адмысловыя вырабы, і яго работа не магла не выклікаць вялікую павагу і захапленне гледачоў. Дарэчы, сучасная багародская разьба — шматаблічна па сюжэтах і формах мастацкага адлюстравання і арганічна ўваходзіць у расійскую мастацкую культуру, захоўваючы пры гэтым старадаўнія традыцыі рамяства.

Выстава-прэзентацыя яшчэ раз прадэманстравала адзінства двух братніх народаў, якія маюць шмат агульнага ў гісторыі, культуры, эканамічным супрацоўніцтве і на будучае маюць жаданне прадоўжыць узаемавыгадныя стасункі.

— Беларусь была, ёсць і ў бліжэйшы час будзе, як гаворыцца, "жытніцай" і "кузняй" для Масквы і Маскоўскай вобласці, дзе пражывае амаль 20 мільёнаў чалавек, — падкрэсліў Васіль Громаў, адказваючы на пытанні журналістаў. — І мы зацікаўлены ў тым, каб адсюль паступала да нас прадукцыя. Але трэба тут, на месцы, развіваць пярвічную перапрацоўку, каб не ганяць пустыя чыгуначныя вагоны. Ці везці да нас тавар, які гатовы да ўжывання або патрабуе невялічкай даводкі. Лічу, гэта выгадна ў першую чаргу нашым партнёрам-беларусам.

Як прагучала падчас выставы, у 2006 годзе ўжо мы збіраемся прэзентаваць айчынную прадукцыю ў Падмаскоўі, дзе пройдуць Дні Беларусі. А ў абодвух бакоў маецца стратэгічны інтарэс адзін да аднаго.

Раіса МАРЧУК

Фота Канстанціна ДРОБАВА

Нам яго не хапае

У сувязі з гадавінай са дня смерці Івана Шамякіна на Маскоўскіх могілках сталіцы адбылося ўшанаванне памяці народнага пісьменніка Беларусі. Ля магілы Івана Пятровіча сабраліся людзі, якія паважалі яго творчасць, былі асабіста знаёмыя з класікам. Сярод іх супрацоўнікі Рэдакцыйна-выдавецкай установы "Літаратура і Мастацтва" М.Мятліцкі, У.Марук, У.Давыдоўскі, з выдавецтва "Мастацкая літаратура" В.Праўдзін і В.Шніп, а таксама літаратары Л.Рублеўская, Г.Чарказян, А.Пашкевіч, М.Тычына ды расійскі пісьменнік І.Расолаў, выкладчыкі БДУ (кафедры беларускай літаратуры і культуры) А.Бельскі, В.Казлова ды іншыя.

Прысутнымі было сказана шмат цёплых, шчырых слоў пра Івана Пятровіча як творцу і чалавека, грамадзяніна сваёй краіны. Успамінамі пра І.Шамякіна з прысутнымі падзяліліся Вольга Казлова і Міхась Тычына.

Старшыня СБП Алесь Пашкевіч, прынамсі, адзначыў, што першыя словы, якія прыгадваюцца ў такі дзень, гэта словы "не хапае". Не хапае, не стае ўсім нам, народу Беларусі і, у першую чаргу, літаратарам, мудрага рупліўцы, Івана Шамякіна.

Расійскі пісьменнік І.Расолаў сказаў, што Іван Пятровіч пакінуў вялікі след не толькі ў беларускай, але і ў рускай ды сусветнай літаратуры. Пра творчасць беларускага класіка можна гаварыць бясконца, і лепш за ўсё гэта рабіць на роднай мове літаратара.

Мікола Мятліцкі падкрэсліў, што жыццё сапраўднага пісьменніка не завяршаецца з заканчэннем зямнога шляху. Застаецца вялікая духоўная спадчына, а ў І.Шамякіна — гэта тамы раманаў, аповесцей, драм, нарысаў, дарожных нататкаў ды дзённікаў. Гэта ж зазначыў і Віктар Праўдзін, дадаўшы, што ў выдавецтве "Мастацкая літаратура" прадаўжаецца праца над дзесяцітомным выданнем збору твораў І.Шамякіна; да таго ж прынята рашэнне прысвяціць класіку беларускай літаратуры кнігу з серыі "Жыццё знакамітых людзей Беларусі".

В.К.

Фота аўтара

Велічным спевам званоў і ўрачыстым малебнам было адзначана адкрыццё "Пакроўскага кірмашу" ў беларускай сталіцы. Выстава царкоўных рэчаў, духоўнай літаратуры і рамесніцкіх вырабаў сталася адметнай падзеяй для праваслаўных вернікаў і тых, хто пакуль толькі шукае свой шлях да храма.

ДА СУСТРЭЧЫ на калядным кірмашы

"У кірмашы, які размясціўся ў мінскім Палацы спорту, прынялі ўдзел каля 80-ці манастыроў, брацтваў, царкоўных прыходаў з Беларусі, Расіі, Украіны і нават ЗША. Вядома ж, госці завіталі не з пустымі рукамі: яны прапанавалі наведвальнікам прадукцыю ўласнай вытворчасці.

Апрача таго, вернікі мелі магчымасць пакланіцца знакамітым іконам, пабываць на майстар-класах народных умельцаў... Пра гісторыю і асаблівасці правядзення такіх кірмашоў распавёў дырэктар выставачнага прадпрыемства "Экспафорум" Аляксандр Савін, які, дарэчы, не так даўно стаў лаўрэатам прэміі "За духоўнае адраджэнне":

— Царкоўныя выстаўкі маюць шматвекавыя традыцыі. Калі Магдэбургскае права пашырылася і на Беларусь, людзі сталі збірацца на гарадскіх плошчах з нагоды храмавых святаў. Менавіта тады з дазволу афіцыйных улад пачалі ладзіцца царкоўныя таргі і кірмашы. Новы адлік мы вядзём з 2002 года, калі Мітрапаліт Філарэт блаславіў правядзенне ў Мінску трох праваслаўных выставак: "Ражаство Хрыстова", "Вербны кірмаш" (напярэдадні Вялікадня) і "Пакроўскі" (восенню).

— Аляксандр Альбертавіч, раскажыце, калі ласка, пра ўдзельнікаў сёлетняга кірмашу.

— Наша выстава адметна тым, што мы працуем з царкоўнымі арганізацыямі. Геаграфія даволі шырокая: расійскія, украінскія, беларускія манастыры... Стараемся падтрымліваць айчынных умельцаў. Яны ў сваю чаргу дзеляцца з наведвальнікамі сваім майстэрствам: нехта займаецца шыццём з абрэзкаў, некаму больш даспадобы лозапляценне альбо разьба па дрэве. Яшчэ адна асаблівасць кірмашу — тое, што манастыры, плённа папрацаваўшы на працягу года, вязуць на выставу лішкі сваіх запасаў: садавіну, агародніну, зёлкі...

— Ці дапамагаюць вам улады?

— Сёння царква ўсебакова падтрымліваецца. Нам дапамагаюць Мінгарвыканкам і міністэрствы, якія займаюцца пытаннямі культуры і адукацыі. Не абыходзяць увагай кірмаш і сродкі масавай інфармацыі.

— А як наконт прыватных асоб?

— Людзі заможныя паспрыялі будаўнічымі матэрыяламі. Дый, увогуле, простая свечка, набытая ў царкве, — таксама ахвяраванне.

* * *

Сёлетні "Пакроўскі кірмаш" парадаваў багаццем кніжнай, аўдыё- і відэапрадукцыі праваслаўных устаноў, разнастайнасцю культурна-асветніцкай праграмы. Прайшлі выступленні дзіцячых калектываў, адбыліся цікавыя і карысныя сустрэчы з духоўнымі асобамі.

Той, хто не патрапіў на выставу, канечне, многае страціў. Але засмучацца не варта: да студзеньскага каляднага кірмашу засталося не так ужо і шмат часу.

Святлана Саўко

Фота аўтара

АБСЯГІ

БРЭСТЧЫНА

Спявайце, «Сяброўкі»

Народнаму жаночаму ансамблю "Сяброўкі", створанаму ў Івацэвіцкім гарадскім Доме культуры, споўнілася 15 гадоў. К.Несцяровіч, С.Шаўлінская, З.Букатая, В.Калмыкова, а таксама В.Радзюк, І.Новік ды В.Бусяцкая — нязменная аснова ансамбля вось ужо на працягу дзесяці год. Маладыя жанчыны ў свой рэпертуар уключаюць беларускія, рускія і ўкраінскія народныя песні, творы айчынных кампазітараў. Летась "Сяброўкі" ўдзельнічалі ў 23 канцэртах, шэсць з якіх — сольныя. І заўсёды спявачкі пакідаюць сцэну пад шчырыя апладысменты.

— Калі бачым, што ў зале нам падпяваюць, лічым сваю задачу выкананай: песня абудзіла душу чалавека, сагрэла яго сэрца, — кажа цяперашні кіраўнік ансамбля Кацярына Несцяровіч. — Галоўнае для нас — поўны давер і кантакт. Значыць, мы на правільным шляху, патрэбныя гэтым людзям.

Самабытнае майстэрства гурта адзначана самымі рознымі ўзнагародамі: дыпломы лаўрэата абласнога тура-фестывалю "Беларусь — мая песня", рэспубліканскага конкурсу "Ляці, наша песня", міжнароднага конкурсу-фестывалю "Палескі карагод-2002" ды процьма грамат, атрыманых непасрэдна ў сваім раёне. У 2003 годзе ансамблю прысвоена званне "народны".

Алесь ЛАЎРАНЮК

ГОМЕЛЬШЧЫНА

Аб'ядноўваюць дняпроўскія хвалі

Міжнародны літаратурны альманах "Днепровские волны", які выйшаў нядаўна з друку ў Магілёўскай абласной друкарні імя Спірыдона Собаля, аб'ядноўвае творы чатырох дзесяткаў аўтараў. Амаль паўтысячы старонак займаюць творы паэтаў, празаікаў і публіцыстаў Рагачоўшчыны, Расіі і Украіны. У кнізе змешчаны творы як вядомых майстроў літаратурнага слова, так і маладых літаратараў. Але іх аб'ядноўвае многае: любоў да Радзімы, прыроды, пашана да гераічнага мінулага Айчыны і яе людзей.

Сярод аўтараў — знакаміты рагачовец, журналіст і пісьменнік Валянцін Дончык, члены саюза пісьменнікаў Расіі Леанід Трызна, Анатоль Шарапіцкі, а таксама ўкраінскія паэты Ала Патапава, Віктар Шлапак ды нашы паэты і пісьменнікі Мікола Янчанка, Уладзімір Немізанскі, Васіль Ткачоў, Васіль Клімянкоў і інш.

Кніга створана па ініцыятыве Рагачоўскага краязнаўчага цэнтра і стане добрым дапаможнікам для настаўнікаў, вучняў і студэнтаў, якія вывучаюць краязнаўства і літаратуру.

Міхась СЛІВА

МІНШЧЫНА

Пасялілася ў музеі казка

Пад Мінскам, у будынку Заслаўскага лясніцтва, адкрылася незвычайная для нашай краіны ўстанова — дзіцячы музей міфалогіі і лесу. Яго гаспадары ўпэўнены: тут будзе цікава не толькі хлопчыкам і дзяўчынкам, але і іх бацькам, настаўнікам, усім, хто імкнецца сустрэцца з чымсьці неардынарным. Пакуль такі вопыт — адзіны ў Беларусі.

Экспазіцыя музея асабліва ўздзейнічае на малечу. Перад іх вачыма ў лясных дэкарацыях па-гаспадарску размясціліся героі казак: пярэварацень, вадзянік, лясун, хатнічак, вужыны цар, балотнік. А аповед экскурсавода толькі ўзмацняе ўбачанае.

Плануецца, што бліжэй да навагодніх свят у памяшканні лясніцтва абсталююць і рэзідэнцыю Дзеда Мароза.

Р. М.

Дзесяць год з імем класіка

У Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка прайшлі пятыя рэспубліканскія Танкаўскія чытанні, прысвечаныя 10-годдзю надання гэтай вышэйшай навучальнай установе імя народнага паэта Беларусі.

У чытаннях бралі ўдзел рэктар установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка", член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар тэхнічных навук, прафесар П.Кухарчык, кандыдат педагагічных навук, дацэнт А.Лугоўскі, доктар палітычных навук В.Бушчык, дырэктар Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар У.Гніламёдаў, а таксама шматлікія выкладчыкі, пісьменнікі, студэнты, землякі паэта — дырэктар Мядзельскай раённай бібліятэкі імя Максіма Танка Л.Несцяровіч, загадчык ідэалагічнага аддзела Мядзельскага райвыканкама В.Зуеўская ды дырэктар Сваткаўскай школы, якая таксама носіць імя слыннага паэта...

Ва ўступным слове рэктар установы Пётр Кухарчык павітаў прысутных і падкрэсліў: "Нам вельмі пачэсна насіць імя гэтага выдатнага сына беларускага народа, і Танкаўскія чытанні заўсёды будуць традыцыйнымі для нашага універсітэта...

У асобе Максіма Танка, — працягваў Пётр Дзмітрыевіч, — непарыўна паяднаны паэт і грамадзянін. Творчасць выдатнага літаратара была скіравана на ўзвелічэнне чалавека, яго духоўнае вызваленне з-пад улады прыгнятаючых абставін жыцця. Максім Танк пакінуў пасля сябе багатую творчую спадчыну, і паводле пастановы ўрада рыхтуецца да выдання поўны збор твораў паэта".

Падчас пленарнага пасяджэння з дакладамі выступілі доктар філалагічных навук, прафесар У.Гніламёдаў, кандыдат філалагічных навук, прафесар А.Рагуля, паэт, сябра сям'і Скурко У.Карызна...

У сваім дакладзе "Максім Танк: Маральна-філасофскі пошук" Уладзімір Гніламёдаў прыгадаў жыццёвы ды творчы шлях класіка беларускага слова і зазначыў: "На прыкладзе М.Танка мы заўважаем схільнасць сучаснай паэзіі да рэалістычнай прадметнасці, да паглыблення ідэйна-эмацыйнай ёмістасці мастацкага вобраза".

Падчас Танкаўскіх чытанняў адбылося ўручэнне грашовых прэмій са Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы адораных студэнтаў і навучэнцаў студэнтам-пераможцам рэспубліканскіх конкурсаў навуковых і творчых работ.

Пасля афіцыйнай часткі мерапрыемства прайшлі пасяджэнні секцый па тэмах "Актуальныя праблемы паэтыкі", "Мастацтва і духоўнае спасціжэнне суб'екта" ды падвядзенне вынікаў чытанняў.

Рэктар універсітэта П.Кухарчык адзначыў, што па творчасці Максіма Танка студэнты пішуць дыпломныя і курсавыя работы. Паводле кожных Танкаўскіх чытанняў выдаюцца зборнікі матэрыялаў, у якіх аналізуюцца найбольш актуальныя пытанні вывучэння мастацкай спадчыны выдатнага паэта. І сёлетнія чытанні не выключэнне, бо ўдзельнікамі зроблены значны ўнёсак для далейшай распрацоўкі танказнаўства.

В.КАВАЛЁЎ

Фота аўтара

Тут жыве памяць. Аб вайне

Афіцыйны дзень стварэння Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — 22 кастрычніка 1944 года. У вызваленым Мінску першыя наведвальнікі з вялікім хваляваннем пераступалі парог гэтай установы — фронт адкаціўся на Захад, а жахі вайны яшчэ трымаліся ў людской свядомасці.

Рашэнне аб стварэнні музея было прынята ЦК Кампартыі Беларусі яшчэ ў 43-м, які знаходзіўся тады ў Маскве. Менавіта там, у Белакаменнай, у лістападзе 1942 года падчас рэспубліканскай выставы "Беларусь жыве, Беларусь змагаецца..." адкрылася першая экспазіцыя — правобраз пастаяннай.

На сённяшні дзень у музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а ён вядомы далёка за межамі нашай краіны, пабывалі амаль 15 мільёнаў чалавек. У 25 залах прадстаўлена 4,5 тысячы экспанатаў — залаты фонд пастаяннай экспазіцыі. А ўсяго ўстанова налічвае больш за 140 тысяч рэліквій.

Р. М.

Ясеніну прысвячаецца

Вечарына, прысвечаная 110-годдзю Сяргея Ясеніна, адбылася ў Доме дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі. Пра жыццёвы і творчы шлях славутага рускага паэта, творчасць якога – неацэнны ўнёсак у скарбонку сусветнай культуры, своеасаблівасць паэтычнага светабачання, стасункі з беларускімі літаратарамі распавялі старшыня таварыства "Беларусь — Расія" Раіса Баравікова, паэты Васіль Жуковіч, Анатоль Вярцінскі, Уладзімір Скарынкін, Аксана Данільчык. У вечарыне ўзялі ўдзел супрацоўнікі пасольства Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Прысутныя пачулі цудоўную паэзію "апошняга сялянскага паэта" Расіі, а таксама рамансы на яго вершы.

Марыя РУДОВІЧ

Зямля, родная сэрцу

У выдавецтве "Беллітфонд" пабачыла свет новая кніга паэтак Тамары Мазур і Тамары Кашавой. Узнёсласць душы, узрушанасць, з якой яны пішуць пра родны горад, адлюстравана і ў назве кнігі "Ваўкавыск — радзімка Беларусі...". Акунуцца ў старажытныя часы горада, зрабіць невялічкі экскурс у наша мінулае, каб зарадзіцца станоўчай энергіяй продкаў, якія неслі ў свет самыя лепшыя чалавечыя пачуцці: радасць, міласэрнасць ды любоў, можна праз вершы "Радзімка Беларусі", "Ваўкавыя", "Праз стагоддзі", а таксама паэмы Т.Мазур "Споведзь адной душы" і Т.Кашавой "Кошык з замкавага лесу".

Кранаюць душу верш Т.Мазур "Ліст ад беларусачкі", Т.Кашавой "Краіна-каханне", музычная п'еса-казка "Каліф-журавель" і шматлікія песні. Паэткі бурштынавай нізкай звязалі свае творы, прысвечаныя 1000-годдзю роднага горада, каб данесці да чытача сваю любоў і захапленне роднымі мясцінамі.

Лідзія АДАМОВІЧ

Светач Караткевіча

Пабачыла свет новая работа графіка Уладзіміра Лукшы "О радзіма, мой светач цудоўны". Менавіта так называецца і кніга, якая аб'яднала вершы Уладзіміра Караткевіча і вілейскага мастака, які гэтым разам адлюстраваў караткевічаўскія адрасы Оршы — калыскі славутага класіка беларускай літаратуры.

Старонка за старонкай адкрываюць для чытача горад, які выхаваў, сфарміраваў выключнай сілы пісьменніцкі талент. Уладзімір Лукша кліча ў вандроўку па Оршы. Ад чыгуначнага вакзала мы рухаемся на вуліцу Уладзіміра Караткевіча — раней называлася Касманаўтаў. Пазнаёміўшыся са сціплым домікам сям'і пісьменніка, трапляем да школы № 3, дзе ён да Вялікай Айчыннай вучыўся. У 1944 — 1948 гадах Уладзімір займаўся ў школе № 1 — і яна прадстае з малюнка мастака. Этнаграфічны музей "Млын", галоўная арка гарадскога парку, Святадухаўская царква, касцёл святога Юзафа, Орша сучасная і старажытная — такі шматаблічны горад бачыць чытач з лаканічных і разам з тым выразных малюнкаў вілейскага графіка.

— Як мастаку, мне даводзіцца шмат вандраваць па Беларусі, — гаворыць Уладзімір Лукша. — Малюю і нашу сталіцу. У мінулым годзе дарога прывяла мяне ў Оршу. Пазнаёміўшыся з горадам, людзьмі, што сустрэлі мяне ў гасцёўні музея Уладзіміра Караткевіча, не змог не выканаць просьбу аршанцаў — замаляваць мясціны, звязаныя з жыццём класіка беларускай літаратуры. Тут, на Дняпры, ён нарадзіўся, вучыўся, працаваў. Экспазіцыя музея кранула мяне да глыбіні душы... Пры наведванні гэтага краю пашчасціла спазнаць, што ёсць у нас цудоўныя людзі, якія ўмеюць шанаваць і перадаць нашчадкам памяць пра вялікага пісьменніка зямлі беларускай.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ

ВЫБІРАЕМ

якасць, элегантнасць, стыль

Кожны пакупнік жадае атрымаць якасную рэч, якая будзе мець добры выгляд і праслужыць доўга. Асабіста мяне апанавалі сумненні, што такую задачу можна вырашыць на рынку за невялікі кошт у паслужлівых гандляроў-кітайцаў, якія раскладваюць свае дзівосныя тавары прама пад адкрытым небам. Ну, а як у такіх умовах ажыццявіць самае прыемнае — прымерку? Зусім па-іншаму ва універмагу: ніякай спешкі, асобныя прымерачныя, люстры ва ўвесь рост.

Наконт гэтага са мной ніхто не будзе спрачацца, а вось кошт такіх розных тавараў вымушае задумацца. Каб пераканаць паважаных чытачоў, што нашы тавары з кітайскімі і параўноўваць нельга, наведала некалькі айчынных прадпрыемстваў і атрымала аб іх прадукцыі інфармацыю, якую не прачытаеш на этыкетцы.

Беларуская «Мастра»

Думаю, цяжка знайсці жанчыну, якая ніколі не чула назву "Мастра". Да 1992 года гэта прадпрыемства называлася фабрыкай мастацкіх вырабаў, а потым набыло, на першы погляд, даволі экзатычнае імя. Як растлумачыла начальнік камерцыйнага аддзела і маркетынгу Людміла Мацюшава, усё проста: слова "Мастра" расшыфроўваецца як "мастацкія рамёствы".

Прадпрыемства выпускае ў асноўным лёгкае жаночае адзенне: блузы, сукенкі, спадніцы, штаны, жакеты, камплекты і касцюмы з разнастайных тканінаў, а таксама вырабы з дзяржаўнай сімволікай.

ААТ "Мастра" мае сваю эксперыментальна-мастацкую лабараторыю па распрацоўцы і падрыхтоўцы да вытворчасці новых мадэляў жаночага адзення. Штогод тут "нараджаюцца" больш за 200 навінак. Вырабы выпускаюцца невялікімі партыямі. А разнастайнасць мадэляў і тканін, высокае майстэрства, вытанчанасць вышыўкі і багацце колераў дазваляюць займаць і ўтрымліваць сваю нішу на рынку нашай рэспублікі і Расіі. Гістарычныя традыцыі народнай творчасці арганічна спалучаюцца з сучасным дызайнам. Народжанае стагоддзямі разуменне прыгажосці, багацця прыроды і шчодрасці душы беларускага народа выпрацавала мастацкі густ і зрабіла прадукцыю "Мастры" вядомай у свеце моды.

Сёння зноў набірае папулярнасць вышыўка, а ААТ "Мастра" шырока выкарыстоўвае яе для аздаблення сваіх вырабаў. Гэта своеасаблівая візітная картка прадпрыемства. Вышыўка-рышэлье, бісер і аплікацыя выкарыстоўваюцца ў мадэлях для жанчын элегантнага ўзросту, а для моладзі прапануюцца сучасныя элементы вышыўкі, новыя эксклюзіўныя дызайнерскія вырашэнні, дзе прысутнічаюць яркія расфарбоўкі. Прыемна бачыць у элементах аздаблення нацыянальныя матывы ў выглядзе кветак альбо беларускага арнаменту.

Асаблівай папулярнасцю ў сёлетнім летнім сезоне карысталася калекцыя адзення з аршанскага льну. Выпусцілі і прадалі амаль 21,5 тысячы адзінак. Зараз рыхтуецца восеньская калекцыя з тканін Мінскага тонкасуконнага і камвольнага камбінатаў, а таксама з матэрыялаў замежных вытворцаў.

Прафесійнасць, творчы пошук, гарманічнае спалучэнне традыцый народнага мастацтва вышыўкі з дасягненнямі сучаснага дызайну ствараюць новы вытанчаны вобраз мадэляў ад "Мастры". Прадпрыемства — вядучае ў нашай рэспубліцы па вытворчасці святочных блузак і камплектаў. Сакрэт папулярнасці маркі "Мастра" — у яе мадэлях: разнастайных па асартыменце, стыльных, практычных і даступных па кошце. Вырабы фабрыкі адзначаны дыпломамі і граматамі на беларускіх і міжнародных кірмашах-выставах, а яе мастакі-мадэльеры — неаднаразовыя пераможцы і лаўрэаты рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў.

Экстравагантная «Эладэя»

Расце на беларускіх балотах прыгожая кветка пад назвай эладэя. Менавіта ад гэтага слова ўтварылася імя вытворчага унітарнага прадпрыемства "Эладэя" — грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз тэатральных дзеячаў". Гэта адна з больш сталых швейных фабрык Беларусі. Яна прапаноўвае моднае жаночае адзенне. Прадпрыемства пастаўляе вырабы на ўнутраны рынак, імпартуе іх у Расію, а таксама краіны бліжняга і далёкага замежжа, выконвае заказы дзяржаўных, грамадскіх і прыватных структур на вытворчасць уніформы і спецадзення, забяспечвае тэатральнымі і сцэнічнымі касцюмамі прафесійныя і аматарскія творчыя калектывы рэспублікі. УП "Эладэя" ў апошнія гады пастаянна выйграе тэндэр Міністэрства лясной гаспадаркі на пашыў форменнай вопраткі для працаўнікоў сваёй сістэмы.

Асобым попытам карыстаюцца высакаякасныя вырабы, зробленыя па сучаснай еўрапейскай тэхналогіі. Апошнім часам у моду ўвайшоў усходні стыль, што адразу адлюстравалася ў асартыменце "Эладэі": з'явіліся цудоўныя мадэлі блузак, спадніц, штаноў з лёгкіх празрыстых тканін. Сапраўдная прыгажосць! Асабіста я набыла адразу некалькі рэчаў і засталася вельмі задаволена іх якасцю і практычнасцю.

Сёлета фабрыка парадавала цікавымі вырабамі з шыфону, які займае трывалую пазіцыю ў сучаснай модзе. Лёгкасць і элегантнасць гэтай тканіны дазваляе аб'ядноўваць класіку і авангард, і адзенне ў выніку выглядае вельмі прывабна. Дзякуючы пластычнасці матэрыялу, вырабы могуць быць і функцыянальнымі, і дэкаратыўнымі адначасова. Шыфон сімвалізуе далікатную жаноцкасць і з'яўляецца ўвасабленнем непаўторнага шыку. Шматслойнасць вопраткі дазваляе стварыць пералівы колераў, а лёгкі какетлівы характар мадэлі надае яе ўладальніцы загадкавую рамантычнасць.

Элегантная «Элема»

Падрабязныя звесткі аб знакамітай "Элеме" я атрымала ад менеджэра камерцыйнага аддзела Алены Раманоўскай. Прадпрыемства было створана ў далёкім 1930 годзе і спачатку называлася швейнай фабрыкай імя Н.К.Крупскай. Падчас перабудовы прадпрыемства рэарганізавалі і яно атрымала назву "Элема", што азначае элегантнае моднае адзенне.

Сёння фабрыка — адна з буйнейшых вытворцаў адзення ў Беларусі і краінах СНД. Традыцыйная прадукцыя "Элемы" — верхняя жаночая вопратка: зімовыя і дэмісезонныя паліто, паўпаліто, курткі, касцюмы, якія карыстаюцца нязменным попытам, як у рэспубліцы, так і за яе межамі. Новыя летнія калекцыі — сукенкі, лёгкія касцюмы, блузы таксама атрымалі шырокае прызнанне пакупнікоў.

Не пакідае "Элема" без увагі і мужчын. У мінулым сезоне яны маглі набыць пінжакі з айчыннага льну. Ужо не першы год вабяць вока сучасныя мадэлі мужчынскіх паліто з выдатных тканін, а летась прадпрыемства прапанавала лінію мужчынскіх касцюмаў. Хутка з'явіцца ў продажы элегантна-класічная калекцыя святочнага прызначэння.

Не забыліся тут і пра вучняў. Для іх распрацавана лінія школьнага адзення.

На фабрыцы створаны дызайн-цэнтр, у якім працуе каля 30 спецыялістаў: мастакі, канструктары. Існуе і асобны швейны цэх, дзе распрацоўваюцца калекцыі. Брытанская фірма "Shani LTD" нават арганізавала тут свой дызайнерскі цэнтр, у якім працуюць як замежныя, так і нашы спецыялісты. Яго стварэнне дазваляе запазычаць і распрацоўваць навінкі канструктыўнага вырашэння, каб быць на адным узроўні з Еўропай. Але трэба адзначыць, што пакуль гэта не вельмі ўдаецца, бо наш пакупнік адрозніваецца ад еўрапейскага. Так, дзесьці пяць гадоў таму беларускім спажыўцам прапанавалі твідавыя паліто, якія былі вельмі актуальнымі ў той час у Еўропе. Вырабы прадаваліся вельмі цяжка, а вось у гэтым сезоне яны сталі вельмі папулярнымі ў нас, а за мяжой мода на іх адыходзіць. Закранаючы твідавыя мадэлі паліто, хочацца звярнуць увагу пакупнікоў на тое, што сёлета модны не класічны твід, а ячэісты, з дадаткам люрэксу. Гладкія матэрыялы адыходзяць на другі план. У будучай вясенняй калекцыі мы ўбачым вырабы з велюру, драпу, упрыгожаныя кантрастнай вышыўкай. Сапраўдная навінка — аздабленне паліто карункамі. Модным становіцца вельвет. Ён можа быць у кветачкі ці з геаметрычным малюнкам. Для восені прадугледжана вельветавае адзенне з уцяпляльнікам. Калекцыя восень — зіма была прадстаўлена на суд аптовых пакупнікоў яшчэ ў канцы вясны. Мадэлі атрымалі ацэнку, вытворцы ўлічылі парады і пажаданні аптавікоў, штосьці дапрацавалі, а значыць, яшчэ больш палепшылі якасць.

"Элема" выпускае вопратку трох напрамкаў: класічнага, маладзёжнага, і спецыяльную лінію адзення вялікіх памераў (да 60-га). Касцюмы шыюцца невялікімі партыямі — каля 500—700 адзінак і ідуць на рынкі Беларусі і Расіі. Эксклюзіўныя калекцыі налічваюць усяго 50—100 вырабаў.

Вяртаючыся да актуальнага пытання аб зімовым адзенні, трэба адзначыць, што ў куртках выкарыстоўваецца ўцяпляльнік новага пакалення — "Файбертэк", які, дарэчы, вырабляецца ў Мінску. Такая вопратка разлічана на тэмпературу мінус 20—25 градусаў. Паліто і курткі з такім уцяпляльнікам вельмі лёгкія і практычныя.

Прадпрыемства "Элема" — буйнейшы вытворца зімовага адзення на рынку Беларусі і Расіі. З 2003 года прадукцыя сертыфіцыруецца па міжнародным стандарце ІСО 9001.

Безумоўна, усё вышэй пералічанае прываблівае замежных заказчыкаў. Паступаюць заказы на вытворчасць дзіцячага адзення, школьнай формы з сімволікай адпаведнай установы. Рэгулярныя спецзаказы выконваюцца для Францыі і Англіі. На сённяшні дзень у "Элемы" наладжаны сувязі з прадпрыемствамі Італіі, Германіі, Турцыі, Карэі, Чэхіі і іншых краін.

Высокая якасць і элегантнасць вырабаў, клопат аб спажыўцах, надзейнасць у партнёрстве спадарожнічаюць "Элеме" ўсе 70 гадоў яе прадуктыўнай дзейнасці.

Модная «Мілавіца»

Не ўсім вядома, што зорку кахання Венеру называюць прыгожаю беларускаю назваю — Мілавіца. Адсюль і паходжанне гандлёвай маркі "Мілавіца". Ведаюць аб ёй як у нас, так і далёка за мяжой. Хто ні прыедзе ў Мінск, заўсёды наведвае фірменную краму. Госці сталіцы набываюць шмат вырабаў, бо сваякі, сябры і знаёмыя просяць прывезці штосьці і для іх.

Прадпрыемства пачынае сваю гісторыю з 1908 года. Менавіта тады французскія прадпрымальнікі браты Турнье адкрылі ў Мінску фабрыку галантарэйных тавараў "Франсуа Турнье", якая працавала да першай сусветнай вайны. Потым адбылося некалькі пераўтварэнняў прадпрыемства.

Родапачынальніца "Мілавіцы" — фабрыка "Беларуска", утвораная ў 1929 годзе. Гэта першае прадпрыемства ў СССР, якое выпускала вырабы з пластмасы (гузікі, грэбні, жаночыя шпількі, прыколкі). У 70-м было створана прадпрыемства "Камсамолка", якое займалася вытворчасцю жаночай бялізны і адзення для немаўлят і дзяцей ясельнага ўзросту.

Назву "Мілавіца" фабрыка атрымала ў 1991 годзе, калі стала арэндным прадпрыемствам. На наступны год маёмасць фабрыкі выкупілі члены арэнднага калектыву, і прадпрыемства набыло новы статус — акцыянернае таварыства закрытага тыпу.

У 1996 годзе "Мілавіца" атрымоўвае першы ў рэспубліцы сертыфікат якасці ІСО 9001, а праз чатыры гады — замежныя інвестыцыі і становіцца сумесным прадпрыемствам з "Ілуна груп" (Італія) і "Еўрапейскім банкам рэканструкцыі і развіцця". Цяпер гэта самая буйная экспартная кампанія ў Беларусі.

"Мілавіца" заслужыла прызнанне жанчын сваімі прыгожымі, практычнымі і якаснымі вырабамі. Калекцыі рэгулярна абнаўляюцца, і кожны сезон дызайнеры кампаніі папаўняюць яе новымі мадэлямі ў адпаведнасці з апошнімі распрацоўкамі бялізнавай моды і пажаданнямі спажыўцоў.

Ёсць чым пахваліцца беларускім вытворцам! А разам з імі і нам, спажыўцам. З абсалютнай упэўненасцю і асобым гонарам магу сцвярджаць, што айчынная прадукцыя, бясспрэчна, вартая нашай увагі. Да таго ж, аддаючы перавагу таварам, вырабленым у нашай краіне, мы не толькі падтрымліваем сваіх вытворцаў, а і выбіраем якасць, элегантнасць, стыль і прыгажосць.

Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ

Фота забяспечана аўтарам

ТВОРЫ НЕ ПАВІННЫ ПЫЛІЦЦА Ў МАЙСТЭРНІ...

Да нядаўняга часу амаль усе значныя мастацкія цэнтры і выставачныя пляцоўкі нашай сталіцы мелі статус агульнанацыянальных, як Нацыянальны мастацкі музей, ці належалі грамадскім арганізацыям рэспубліканскага значэння, як Галерэя Беларускага саюза мастакоў... Больш за ўсё статусу гарадской адпавядае вядомая аматарам мастацтва галерэя "NOVA" пры Цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы, якая дзейнічае дзякуючы намаганням і ініцыятыве яе супрацоўнікаў. А два гады таму ў Мінску адбылася беспрэцэдэнтная падзея — расчыніла свае дзверы першая муніцыпальная галерэя — Гарадская мастацкая галерэя твораў Л. Шчамялёва. З яе дырэктарам — мастацтвазнаўцай Таццянай БЕМБЕЛЬ — наша гутарка.

— Спадарыня Таццяна, вядома, што на Захадзе нават невялічкі горад мае ўласную галерэю...

— Так, у сусветнай традыцыі гарадская мастацкая галерэя, як і ратуша, — знак і твар горада. З часоў сярэднявечча ў ратушах, як правіла, і захоўваліся калекцыі твораў мастацтва, якія належалі гораду. У еўрапейскіх гарадах муніцыпальныя калекцыі фарміраваліся стагоддзямі: гораду дарылі, горад заказваў...

У ЗША традыцыі значна маладзейшыя, але і яны трывала ўсталяваны: тут дарунак гораду асобных твораў мастацтва і цэлых калекцый — адна з прынятых форм праявы як мясцовага, так і агульнага патрыятызму. Тысячы нічым не прыкметных амерыканскіх гараджан увекавечылі такім чынам сваё імя. У сваю чаргу ўдзячны горад, як правіла, адказвае ўзаемнасцю гараджаніну. Высякае імя на мармуровай пліце або ўвекавечвае бюстам. Такім чынам, у Новым Свеце гарадская галерэя — не толькі сховішча артэфактаў, але і месца выяўлення ўзаемных адносін і пачуццяў Горада і Гараджан ў эстэтызаваных формах.

— А якая перадгісторыя стварэння першай гарадской галерэі ў Мінску, якая носіць імя знакамітага мастака Л. Шчамялёва?

— Канкрэтным штуршком для рашэння Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта аб стварэнні галерэі пры упраўленні культуры з'явілася тое, што народны мастак Беларусі Леанід Шчамялёў падараваў гораду калекцыю сваіх твораў жывапісу. (Напярэдадні свайго васьмідзесяцігоддзя Л. Шчамялёў падарыў беларускай сталіцы каля сямідзесяці сваіх работ.) Як адзначае сам Леанід Дзмітрыевіч, работы мастака павінны жыць — сустракаць людскія позіркі, а не пыліцца ў майстэрні.

Увогуле, Л.Шчамялёў — знакавая асоба. Ураджэнец Віцебска, дзе працавалі Шагал, Малевіч, Лісіцкі, ён большую частку жыцця правёў у Мінску. Мастак — выпускнік першага набору (1953 — 1959) аддзялення жывапісу Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута, вучань знакамітага майстра пейзажу Віталя Цвіркі.

Трэба адзначыць, што творчасць Л. Шчамялёва карыстаецца попытам у нашай краіне як і дзесяць, і дваццаць ды і сорак год таму. Устойлівасць такой увагі можна патлумачыць рознымі прычынамі, але народны мастак, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, кавалер ордэна Францыска Скарыны, уладальнік многіх іншых узнагарод — нават калі б не меў такіх рэгалій, усё роўна заставаўся б адным з самых папулярных у Беларусі мастакоў "пакалення бацькоў". Займаючы ўстойлівае і бясспрэчнае месца ў прафесійнай сферы, Л.Шчамялёў перш за ўсё яркая персона, да яго слоў прыслухоўваюцца, а да ўчынкаў прыглядаюцца ў культурным асяродку. Вось чаму адкрыццё Гарадской мастацкай галерэі твораў Л.Шчамялёва ў сталіцы было сустрэта грамадскасцю як адна са значных культурных падзей года.

— Галерэя мае дзве залы...

— Так, у першай зале экспануецца пастаянная калекцыя работ Л.Шчамялёва, якія ён перадаў гораду. Другая ж зала — для зменных выставак.

— Дарэчы, зусім нядаўна мінчукі маглі паглядзець тут работы Вячаслава Рускевіча.

— Сапраўды. З апошніх у нас выстаўляўся мастак Вячаслаў Рускевіч, і я хачу сказаць колькі слоў пра яго. Вячаслаў Канстанцінавіч — чалавек пасляваеннага пакалення (нарадзіўся ў 1947 годзе). Фарміраванне светапогляду мастака прыпала на поўныя надзей шасцідзесятыя: закончыўшы ў 1967-м Мінскае мастацкае вучылішча, ён вярнуўся туды пасля інстытута. Магчыма, і выкладаць пайшоў туды таму, што месца было жывое, вельмі цікавае: пра жыццё ў 1960-я гады ў вучэльні былыя студэнты ўзгадваюць як пра надзвычай дынамічнае і насычанае дзякуючы рабоце там цэлай плеяды мастакоў-педагогаў. А сярод іх былі, да слова, Леанід Шчамялёў і Альгерд Маліштэўскі, пра якіх Вячаслаў Рускевіч узгадвае з асаблівым пачуццём удзячнасці.

Больш за дваццаць пяць гадоў адпрацаваўшы ў Мінскім мастацкім вучылішчы імя А. Глебава ды выхаваўшы не адно пакаленне маладых мастакоў, ветэран беларускай мастацкай педагогікі Вячаслаў Канстанцінавіч пакінуў выкладчыцкую дзейнасць і, нарэшце, зрабіў тое, пра што даўно марыў — цалкам прысвяціў сябе творчасці.

Ён працуе ў станковым жывапісе, а найбольш у жанры партрэта, што і было адлюстравана ў экспазіцыі, якая аб'ядноўвала работы майстра за перыяд больш як пятнаццаць гадоў.

Трэба адзначыць, што творы Вячаслава Рускевіча ўвайшлі ў зборы Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі, фондаў Беларускага саюза мастакоў, Гродзенскага музея гісторыі рэлігіі, а таксама ў прыватныя калекцыі.

— А якія прынцыпы адбору, хто вырашае ды ад чаго залежыць, чые работы будуць экспанавацца ў вашай галерэі?

— Існуе некалькі варыянтаў. Па-першае, ёсць форма заяўкі, дзе мастак сам прапаноўвае выставіцца ў нашай галерэі. Мы збіраем такія заявы, разглядаем. (Зазвычай складаем план выставак на год наперад.) Наконт прафесійных мастакоў, каго выстаўляць, кансультуемся з Леанідам Шчамялёвым. Па-другое, часам ён сам прапаноўвае кандыдатуры. Таксама можам падтрымаць маладога, невядомага шырокаму колу мастака. Але намагаемся, каб яго творы суадносіліся з выстаўкай і мелі добры прафесійны ўзровень.

— Наконт работ, мастак сам акрэслівае, што будзе экспанавацца?

— У бальшыні выпадкаў. Але звычайна я сама іду ў майстэрню, каб распытаць творцу. Бо нават у прэс-рэлізе трэба даць хоць якую-небудзь караценькую інфармацыю пра творчасць, вызначыць асабістую канцэпцыю. Візіт у майстэрню часам уносіць карэктывы ў адбор работ. Бываюць выпадкі, калі знаходзіш работу амаль што не ў сметніцы, дзе-небудзь у куце. Мастак лічыць яе не вартай, а на самай справе творцы проста не заўсёды адэкватна могуць сябе ацаніць...

Увогуле, спектр зменных экспазіцый даволі шырокі: ад прафесіяналаў да выставак дзіцячай творчасці, бо мы супрацоўнічаем з мастацкімі школамі. Сёлета, напрыклад, выстаўляліся дзіцячыя работы, прысвечаныя Мінску і Дню Перамогі. Для моладзі вялікі гонар экспанавацца побач з вядомымі мастакамі: адна справа выстаўляцца ў школе ці ў доме культуры, і зусім іншая — у прафесійнай галерэі. Ды і сама праца з маладым пакаленнем для нас вельмі важная.

— Сярод вашых наведвальнікаў шмат моладзі?

— Хапае. З навакольных школ часам прыходзяць цэлымі класамі. Гэта і першакласнікі, і вучні старэйшых класаў. Наведваюцца таксама навучэнцы ПТВ ды студэнты.

— Ці ладзіце для іх якія-небудзь мерапрыемствы?

— Безумоўна. З аднаго боку, мы праводзім экскурсіі. У нас сабраныя матэрыялы па асноўнай і зменных экспазіцыях. (Маем базу дадзеных пра мастакоў. У марах — сістэматызаваць і зрабіць яе як мага больш поўнай).

Я ці нашы наглядальніцы расказваем пра творчасць і работы не толькі пэўнага мастака, але і пра мастацтва ў цэлым. З другога боку, часам нам замаўляюць сустрэчы з творцам. Да слова, на Дзень ведаў у нас адбыліся дзве сустрэчы навучэнцаў адной са школ і гімназіі з мастаком В.Рускевічам. Мы правялі экскурсіі, а дзеці мелі магчымасць у атуленні карцін творцы паслухаць самога аўтара і задаць яму пытанні.

Падобную выхаваўча-асветніцкую дзейнасць я лічу вельмі важнай для такога раёна, як Серабранка. Цэнтр горада насычаны ўстановамі культуры: музеі, галерэі, вернісажы... У Серабранцы ж, акрамя кінатэатра "Салют" і нас, больш нічога няма. Бібліятэкі я не ўлічваю — гэта іншая справа.

— Вы, мабыць, ужо абзавяліся пастаяннымі наведвальнікамі?

— Так, ёсць у нас і пастаянныя наведвальнікі, сярод якіх, што самае прыемнае, вучні навакольных школ. Нехта з іх займаецца ў мастацкіх гуртках, некаторыя самі па сабе прыходзяць, цікавяцца новай экспазіцыяй. Маем пэўны кантынгент мясцовых жыхароў, якія прыкмецілі вітрыну па дарозе ў краму ці на пошту і вырашылі зайсці.

— Што датычыць зменных экспазіцый, яны спецыялізаваныя ці прысутнічаюць розныя віды выяўленчага мастацтва?

— Наконт тэм і разнастайнасці, на мой погляд, гарадская галерэя павінна адлюстроўваць усё: скульптуру, жывапіс, графіку... Мы праводзілі групавыя выстаўкі скульптараў, а вось персанальных пакуль не было. Скульптуры трэба паказваць прасторава. Нашы магчымасці пакуль не дазваляюць гэта зрабіць. На жаль, няма подыумаў ды некаторага абсталявання. Але ўсё наперадзе.

— У планах намячаецца што-небудзь новае?

— У далейшым, з набыццём неабходнага абсталявання, плануем праводзіць, акрамя зменных экспазіцый, музычныя і паэтычныя вечарыны, відэапаказы, ладзіць адкрытыя лекцыі па мастацтве і прафесійныя семінары. Асноўнымі функцыямі гарадской галерэі я лічу прадстаўнічую і, канечне ж, культурна-асветніцкую. Бо, як гаворыцца, музыцы трэба вучыцца, літаратуру таксама трэба вывучаць, а мастацтва нібыта ўсім зразумелае. Калі кожны бачыць, значыць, можа зразумець, што гэта такое. Але гэта не так. Мы маем намер даваць хоць першасныя навыкі ўспрымання: што такое каларыт, колер.

Яшчэ ў планах правядзенне конкурсаў ды фестываляў. Увогуле, задумак шмат, спадзяюся, іх здзейснім, як толькі з'явяцца магчымасці.

— Будучы гарадской галерэяй, ці адчуваеце падтрымку з боку горада?

— Бясспрэчна. Мы вельмі ўдзячныя Мінскаму гарвыканкаму за прадастаўленне памяшкання, аплату арэнды, за дапамогу і падтрымку. Асабіста хочацца падзякаваць начальніку ўпраўлення культуры Мінгарвыканкама Віктару Курашу і нашаму непасрэднаму куратару Наталлі Старыкавай. Яны заўсёды ідуць нам насустрач.

На маю думку, цяпер адбываецца вельмі значны станоўчы працэс: мэрыя бярэ пад сваю апеку шэраг устаноў, якія займаюцца выяўленчым мастацтвам. Гэта толькі на карысць і гораду, і творцам.

Віктар КАВАЛЁЎ

Фота аўтара

У спалучэнні выявы і слова

Слова і выява, вербальнае і візуальнае — праблема для кніжнага мастацтва, сапраўды, адвечная. І не таму, што яна ўвогуле не вырашаецца, а таму, што, здаецца кожнае пакаленне мастакоў вымушана вырашаць яе для сябе нанава. Пры ілюстраванні празаічных літаратурных твораў варыянтаў існуе мноства — ад поўнага і прынцыповага адмаўлення ад фігуратыўных выяў да стараннага адлюстравання ўсіх перыпетый сюжэта, ад павольных, глыбока асабістых асацыяцый "па матывах" літаратурнага твора, да скрупулёзнага, гістарычна дакладнага аднаўлення ўсіх рэалій эпохі (даўно мінулай ці сучаснай), пра якую распавядае пісьменнік.

Пры ілюстраванні паэзіі такой разнастайнасці падыходаў няма. Паэтычнае слова і выява — праблема для кніжнага мастацтва амаль невырашальная. Гісторыя кніжнага мастацтва ведае няшмат удалых ілюстрацый да паэтычных твораў, асабліва калі лірыка гэтая не грамадзянская, а інтымная. І сапраўды — як (і ці магчыма ўвогуле?) перакласці на мову графікі тыя таямнічыя душэўныя зрухі, тыя эмоцыі і пачуцці, часам амаль няўлоўныя самім аўтарам, якія ўвасабляюцца ў паэтычныя радкі? Як не разбурыць любым (нават самым таленавітым) выяўленчым вобразам тую бездань асацыяцый, падчас глыбока асабістых, інтымных, заснаваных на непаўторным жыццёвым вопыце кожнага чалавека, якія і павінна выклікаць паэзія ў душы чытача?

Разумеючы гэта, ілюстратары часцей за ўсё свядома адмаўляюцца ад дэталізацыі сюжэта і абмяжоўваюцца сціплымі элементамі кніжнай аздобы. З дапамогай кніжнага дызайну выяўленчых магчымасцей шрыфтоў, фактуры і колеру паперы, часам з дапамогай заставак і канцовак мастакі імкнуцца выказаць сваё разуменне паэтычных твораў, падрыхтаваць чытача для іх успрымання. Так бывае амаль заўсёды, таму кожнае выключэнне — вельмі цікавіць.

У мінулым годзе на смелы творчы эксперымент адважыліся графік Міхась Барздыка і паэт Міхась Башлакоў. Абодва — людзі сталыя, творча адбыліся і ў нацыянальнай культуры добра вядомыя.

Ураджэнец Віцебшчыны Міхась Барздыка на працягу апошніх дзесяцігоддзяў актыўна працуе як майстар станковай і кніжнай графікі. У яго на дзіва сучаснай па гучанні творчасці ўдала спалучаюцца традыцыйныя народныя матывы і філасофскія разважанні аб сэнсе жыцця і прызначэнні чалавека ў нашым імкліва зменлівым свеце. Творы майстра, азначаныя высокай графічнай культурай, з поспехам экспануюцца на рэспубліканскіх і міжнародных мастацкіх выставах. У 1992 годзе Міхась Барздыка быў узнагароджаны срэбраным медалём Еўрапейскай акадэміі мастацтваў, а ў 1993 годзе на Міжнародным конкурсе графікі ў Бельгіі атрымаў залаты медаль. Творы мастака знаходзяцца зараз у музеях Беларусі, Венгрыі, ЗША, Італіі, Расіі, Францыі.

Міхась Башлакоў нарадзіўся на Гомельшчыне. Адораны ад прыроды тонкім лірычным успрыманнем свету, паэт звяртаецца ў сваёй творчасці да шырокага кола тэм: тут і разважанні пра лёс любай Беларусі ды адвечны кругаварот жыцця яе прыроды, і таямнічыя, што захаваліся яшчэ ад язычніцкіх часоў, народныя паданні, шчымлівыя пачуцці такога рэдкага душэўнага адзінства і такога частага адзіноцтва, што ўзнікаюць падчас чалавечых зносін. Паэзія Міхася Башлакова вылучаецца панарамнасцю і поліфанічнасцю, выключнай шчырасцю і эмацыянальнасцю. Менавіта пры падрыхтоўцы да выдання адной з паэтычных кніг лёс і звёў разам абодвух творцаў. Безумоўна, успрыманне свету ў пластычных вобразах і ў мастацкім слове — рэчы розныя, але з цягам часу гэтыя людзі зразумелі, што яны вельмі блізкія адзін аднаму. Здаецца, калі б Міхась Башлакоў мог маляваць, яго творы былі б падобныя на графічныя аркушы Міхася Барздыкі, і наадварот. У выніку такога паразумення і з'явіўся сумесны праект гэтых аўтараў — кніга графікі і паэзіі "Нетры".

Яна атрымалася незвычайнай — цікавай па задуме і арыгінальнай па форме. Аўтары свядома адмовіліся ад звыклай ролі вядучага і вядомага, яны нават прадставілі свой праект як "кнігу двух мастакоў". І відавочным выяўленчым увасабленнем іх задумы, здаецца, стала ўжо графічнае напісанне аўтарскіх прозвішчаў на строгім белым аркушы паперы, якія нібыта пераўтвараюцца, перацякаюць адно ў адно. Зусім гэтак жа паэтычныя радкі далей неяк непрыкметна і арганічна пераўтвараюцца ў графічныя творы з тым, каб і тыя ў сваю чаргу пераўвасобіліся ў вершы.

Увогуле, выяўленчы рад, створаны Міхасём Барздыкам, наўрад ці можна назваць ілюстрацыямі — мастак існуе ў кнізе зусім на роўных з паэтам, а творы яго — хутчэй яшчэ адзін погляд, своеасаблівыя пластычныя разважанні на прапанаваную тэму. Разважанні гэтыя часам настолькі шчыльна знітаваныя з асобнымі вершамі, што цяжка паверыць, што яны не ствараліся да іх спецыяльна (такіх твораў у кнізе пераважная большасць), а нарадзіліся раней, і потым ужо проста былі знойдзены аўтарамі. Часам жа паэт і мастак разыходзяцца — і разыходзяцца далёка, але гэта разыходжанне падаецца яшчэ больш цікавым, бо дыялог, нават палеміка таленавітых творцаў заўсёды больш змястоўны, чым маналог кожнага з іх.

Аўтары кнігі надалі ёй пэўную дынаміку, яны прадугледзелі, якім чынам чытач будзе ўспрымаць змест выдання. Кожны з сямі паэтычных раздзелаў нібы "абрамляе" графічныя аркушы. Вершы Башлакова і акватынты Барздыкі свядома размешчаны на паперы рознага колеру, іх чаргаванне задае, дакладней кажучы, робіць відавочным той складаны ўнутраны рытм, які прысутнічае ў кнізе.

Рухаючыся ад аднаго раздзела да другога — ад "Вераснёвага смутку", калі настае пара дзівіцца на "Лісце і травы", потым набліжацца да "Прыцудэраў", супакойвацца і забывацца ў "Летуценнях" і "Снявідах", рыхтавацца да "Метамарфозаў" і "Абуджэння" — чытач нібы здзяйсняе падарожжа ці то з адной пары года ў другую, ці то з адной пары чалавечага жыцця ў іншую. Цікава назіраць, як на гэтым шляху паступова — ад восеньскага смутку да вясновага абуджэння — на кніжных старонках праяўляецца колер. Графічныя аркушы, высакародна-стрыманыя, амаль манахромныя ў першых раздзелах набываюць сакавітасць, каляровую выразнасць і нават напружанасць далей, у другой палове кнігі. Не застаюцца нязменнымі і паэтычныя інтанацыі — захоўваючы цеплыню і шчырасць, голас паэта то ўзвышаецца, то набывае асаблівую нягучна-суцішаную даверлівасць...

Аднак, як вядома, пераказваць вершы ці графічныя творы — справа безнадзейная. Разлічаная на шырокае кола аматараў паэзіі і выяўленчага мастацтва, кніга Міхася Барздыкі і Міхася Башлакова, спадзяюся, знойдзе сваіх шчырых прыхільнікаў. Стваральнікі "Нетраў", аўтары і выдаўцы, прадэманстравалі высокую мастацкую культуру, вынаходлівасць, а галоўнае — зацікаўленасць і любоў да сваёй справы. У выніку на Беларусі з'явілася яшчэ адна своеасаблівая, арыгінальная і прыгожая кніга.

А. ПІКУЛІК

БЕЛАРУСКІ ПРАВАСЛАЎНЫ КАЛЯНДАР

Намаганнямі Праваслаўнага брацтва ў гонар Віленскіх мучанікаў у выдавецтве Свята-Петра-Паўлаўскага сабора г. Мінска выдадзены чарговы "Беларускі Праваслаўны каляндар" на 2006 год.

Аснову календара складае традыцыйная богаслужэбная частка. Паколькі працягваецца працэс кананізацыі мучанікаў і вызнаўцаў, якія пацярпелі за Праваслаўе ў гады ганенняў на Царкву ў XX стагоддзі, пералік святых павялічваецца. У раздзеле "Звод імёнаў святых" пералік на кожны дзень года даецца без скарачэнняў з пазначэннем года кананізацыі кожнага святога.

Акрамя таго, у "Календары" прыведзены падрабязныя богаслужэбныя каментарыі і ўказанні евангельскіх чытанняў на кожны дзень. Да ўсіх двунадзесятых святаў змешчаны трапар, кандак і Задастойнік на царкоўнаславянскай і беларускай мовах, а да дзён памяці беларускіх святых — трапар і кандак святога таксама на дзвюх мовах.

Адзін з дадатковых раздзелаў календара прысвечаны свяціцелю Кірылу Тураўскаму — "Залатавусту, які ярчэй за іншых ззяў на Русі". Тут змешчана жыціе свяціцеля Кірылы, складзенае невядомым агіёграфам у канцы XII стагоддзя. У календары ўпершыню надрукаваны творы свц. Кірылы Тураўскага ў перакладзе А. Мельнікава на сучасную беларускую мову. Душакарысныя павучанні і экзэгетычныя разважанні свяціцеля Кірылы настаўляюць нас на ўдумлівае стаўленне да сваёй душы, раскрываюць глыбіні разумення Свяшчэннага Пісання.

У раздзеле "Рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя" прадстаўлена асоба выдатнага царкоўнага і грамадскага дзеяча Вячаслава Багдановіча (1878—1941), які ў міжваенны перыяд 1920—30-х гадоў з'яўляўся адным з аўтарытэтнейшых лідэраў у справе абароны рэлігійных і грамадзянскіх правоў беларусаў у Польшчы. В. Багдановіч быў удзельнікам паменснага Сабору Рускай Праваслаўнай Царквы 1917—18 гг. Яго намаганнямі ў 1920 годзе была аднаўлена дзейнасць Віленскай духоўнай семінарыі, ён жа стаў яе першым пасляваенным рэктарам. З'яўляючыся рэдактарам газеты "Праваслаўная Беларусь", В. Багдановіч падкрэсліваў, што разглядае Царкву як найважнейшую галіну жыцця народа, звяртаўся да тых беларусаў, якія ў сваім жыцці не выракліся сваёй веры і нацыянальнасці.

Як фрагмент публіцыстычнай спадчыны В. Багдановіча ў календары змешчаны яго артыкул "Царкоўнаславянская мова як мова богаслужбовая".

Раздзел календара "Па святых месцах Беларусі" пазнаёміць чытачоў з праваслаўнымі святынямі Брэсцкай епархіі — манастырамі, цудатворнымі іконамі, месцамі, звязанымі з жыццём і дзейнасцю святых зямлі беларускай і праваслаўных дзеячаў Беларусі.

Падрыхтавала Таццяна МАТРУНЧЫК

БЛАСЛАЎЛЁНЫЯ БАЦЬКАЎШЧЫНАЙ

У літаратурна-мастацкім салоне "Сустрэчы на Замкавай" пры Гомельскай гарадской цэнтральнай бібліятэцы імя А.І.Герцэна адбыліся прэзентацыі паэтычных кніг членаў Беларускага саюза журналістаў *Міхася Болсуна* "Яблыня ў фаце" і *Алеся Дуброўскага* "І будзе лета апасля...".

Міхась Болсун — прыхільнік традыцыйнага, класічнага стылю ў паэзіі. Вершы яго — шырокія, напеўныя, шчырыя, пазбаўленыя штампаў і надуманых вобразаў. Асаблівае месца ў творчасці паэта займае грамадзянская лірыка, дзе цяжка сказаць нешта новае. Тут вельмі проста можна збіцца на пыхлівы патрыятызм і натужнае ўсхваленне. Валодаючы паэтычнымі здольнасцямі, Міхась Болсун, тым не менш, многія гады складваў вершы ў скрыню. І вось нарэшце, выйшла яго кніга — прадуманая, сталая, шчодрая, з россыпам паэтычных метафар і прызнаннем у любові — Радзіме, прыродзе, жанчыне. Міхась Болсун — з пакалення падранкаў вайны, "*хоць шрамаў няма на іх целе*", і для тых дзетак "*смак каржоў нішчымных быў лепш, чым "снікерсаў" цяпер*", але ж яны "*галоўны ўсё-ткі свой выйгралі бой — жыццё ацалела падранкаў*".

Пякучым болем напоўнены вершы, прысвечаныя вайне. З 75 загінуўшых воінаў, чые прозвішчы высечаны на абеліску ў вёсцы Палессе, 34 носяць прозвішча Болсун — блізкія і дальнія сваякі паэта. Ім прысвечаны цыкл вершаў.

Бадай, на Гомельшчыне няшмат знойдзецца паэтаў, чыя творчасць у пераважнай большасці — апяванне родных мясцін, куды, на жаль, зрэдку мы наязджаем у сталым узросце, бо справы, справы... А тут жа прайшло наша маленства, юнацтва, яно не адпускае ад сябе, сніцца начамі, кліча нас. Там "*раўчукі мыюць воблакі рупна*", там "*месяц блісне, бы турэцкі нож*", там "*клён пад душ нябесны чуб падставіў*", там "*адшумела восень, адгуляла ўволю, дзеўкай-перастаркай жухлая брыдзе*". Міхась Болсун нарадзіўся на Чачэршчыне — зараз там зона адсялення. У вёсцы — "*болем працятае сэрца крычыць...*", "*хаты-шкілеты і яблынь карчы*", "*вокны забіты — з шалёўкі крыжы*".

Але ж Радзіма, якая б навала ні абрыналася на яе, становіцца яшчэ даражэй. І гэтая адданасць, любоў і павага да родных каранёў пранізвае ўсю творчасць паэта:

Слову не дадзена ў вершах хлусіць —
Пылам мільгне і сатрэцца...
...Рад, што жыву я на Белай Русі,
Тут жа і спыніцца сэрца.

Алесь Дуброўскі многа гадоў працуе ў Гомельскім тэлерадыёаб'яднанні. Вершы друкаваў у перыядычных выданнях. Кніга, якая выйшла ў Таварыстве з дадатковай адказнасцю "Барк", у яго, як і ў М. Болсуна — першая. Звяртаюць на сябе ўвагу цыклы вершаў "Святло шчымлівай памяці", "Кароткае шчасце жыць" ды інш. Аб'ядноўвае іх душэўнасць, сумленнасць, раўнавага, суладнасць з навакольным светам. Творчасць паэта разнастайная: грамадзянска-публіцыстычныя матывы мяжуюць з інтымнымі, пейзажная лірыка пераходзіць у філасофскую:

...Зноў струменіць крыніцай
Празрыстае лета,
А на месцы адной —
Тры вярбы ля вады,
Толькі корань адзін,
Як Радзіма ў паэта!

Паэзія яго пры ўсёй асабістасці лірычных перажыванняў і светаўспрымання — не прыватная справа, яна адрасавана шырокаму колу чытачоў, а верш сябруе з праўдай жыцця, жыве агульнымі клопатамі і непакоем. На многіх творах — пячатка перажытасці і выпакутаванасці тых ісцін, пра якія ідзе размова:

Як падабраць да ісціны ключы,
Якая не падмане і не здрадзіць,
А горшае: тактоўна прамаўчыць,
Каб да сябе цікавасць не адвадзіць?...

Нельга сказаць, што вершы Алеся Дуброўскага перапоўнены паэтычнымі метафарамі, але калі яны ёсць, то ўражваюць своеасаблівасцю і прыгажосцю: "*маланка пыхкае гарачай самакруткай*", "*гарбаты месяц на суседскім клёне марудна лезе ў неба па суках*", "*вятрак, як грыб са страказой на шляпцы*".

У паэта добрае адчуванне беларускага слова, у яго сінанамічнай і дыялектнай варыянтнасці. У творах гучаць фальклорныя матывы, з нетраў народнай паэтыкі ў яго вершы плаўна перацякаюць паралелізмы і сталыя эпітэты.

Ці трэба казаць пра тое, што задача захавання і адраджэння беларускай мовы амаль цалкам ляжыць на плячах пісьменнікаў — найбольш свядомых абаронцаў і рупліўцаў роднага слова. Не абмінае гэтай тэмы і Алесь Дуброўскі:

Прыйшоў на гэты свет я, каб любіць
Зямлю бацькоў гадзінай смутнаю,
Каб мовай веку з часам гаварыць,
Сваю шануючы, — пакутную.

Адчуваецца моцная сувязь паэта з вёскай — арганічная, трывалая. Яму ўдаецца схапіць сутнасць сялянскай працы, апаэтызаваць яе ў вершы "Раніца ў роднай хаце", "Хлеб", "На досвітку даёнкай маці бразгае".

Філасофскія разважанні аб жыцці і смерці, у якіх выразна гучаць бунінскія матывы, аб вечным і аб сусветным і малым набываюць у аўтара нейкую шчымлівую тужлівасць:

...І сонца ўстане спакваля,
Як і раней, паверце!
...І будзе лета апасля
Маёй і вашай смерці...

Але ж жыццесцвярджальнае, аптымістычнае, узнёслае пераважвае матывы наканаванасці лёсу:

Узялося на дождж
спрадвеку:
Сену сохнуць —
небу дажджыць.
Колькі спраў і трывог чалавеку
З-за кароткага шчасця — жыць!

Наталля МАЛАШЭНКА,
заг. аддзела Гомельскай ЦГБ імя А.І.Герцэна

ВЫДАННІ

Лісты ***Ларысы Геніюш*** — своеасаблівы працяг яе кнігі "Споведзь". Не маючы магчымасці публікавацца ў савецкім падцэнзурным друку, паэтка не магла маўчаць, хоць для сваіх успамінаў вымушана была абраць самы непублічны жанр — лістоўны. Яе карэспандэнты жылі ў Беларусі, ЗША, Аўстраліі, Чэхіі, Літве, Польшчы... 355 лістоў увайшло ў зборнік ***"Каб вы ведалі: з эпісталярнай спадчыны (1945 — 1983)"***, які ў беларускай эпісталярнай традыцыі — факт унікальны.

Сёння, калі мы адзначылі 60-годдзе Вялікай Перамогі, жаданне раскрыць усе аспекты вайны набываюць яшчэ большую актуальнасць. Аўтара кнігі аповесцей і апавяданняў ***"Душегуб"*** — ***Васіля Шабалтаса*** цікавяць экзістэнцыйныя пытанні існавання чалавека на вайне, хвалююць яго думкі і спадзяванні, памкненні і ўчынкі.

ГАЮЧАЯ КРЫНІЦА

Ваеннага лётчыка, Рыгора Сароку, які праслужыў на Поўначы больш за дваццаць год і ў адстаўку выйшаў палкоўнікам, як гэта ні парадаксальна, паэтам зрабіла авіякатастрофа. Самалёт разбіўся, а яго выкінула ў велізарную гурбу снегу, якая і ўратавала яму жыццё. Апрытомнеў ён у шпіталі на сёмыя суткі, і першае, што пабачыў, был сонечны зайчык, што трымцеў каля ног жанчыны ў белым халаце, якая падалася яму прыгажуняй. І сонечны зайчык, і жанчына-прыгажуня сталі для яго знакам, што ён будзе жыць. Менавіта там, у бальнічнай палаце, нарадзіліся радкі, прысвечаныя медсястры:

Русская женщина издавна славится,
В мире она на виду,
Много хороших, а наша красавица —
Яблоня в вешнем саду.

Паэт многа пісаў пра родны край, мясціны пад Бялынічамі, дзе ён нарадзіўся і правёў дзяцінства, пра пасляваенныя гады, сваіх равеснікаў і равесніц, працу ў полі і ў лесе, нялёгкія калгасные будні. Паэтычнае слова дапамагала пераадольваць як фізічныя, так і душэўныя нягоды, шукаць сваё месца ў жыцці, бо пасля другога нясчаснага выпадку, ужо аўтамабільнай аварыі, ён вымушаны стаць цывільным чалавекам. Неўзабаве лепшыя яго творы з'явіліся на старонках часопіса "Нёман", рэспубліканскіх газет, прагучалі па радыё. У 2002 годзе выйшла кніга вершаў "Остановитесь, люди, на минуту" (ЗАО "Веды"). А літаральна праз два гады з'явіўся новы зборнік — "Нежность и грусть" ("ТОНПІК". 2004).

Хораша і дакладна гаворыць ва ўступным слове да зборніка сам аўтар, што ў яго вершах "радкі цёплыя і ўтульныя. Часам яны, як звонкі вясновы капеж, звіняць і радуюць, тады-сяды сумуюць". Але побач з мінорнымі ноткамі, у строфах паэта пульсуе жыццё, гарачая і неспакойная энергія. Паэт разважае пра тое, што з ім здарылася, яго цікавяць падзеі, якія адбываюцца ў свеце. Прыслухоўваецца ён і да сваёй душы, быццам хоча адчуць, ці захаваўся ранейшы пал да каханай. Жанчына для яго — вечная загадка, якая то крыху прыадкрываецца, то зноў робіцца непадступнай...

Няцяжка заўважыць, што найбольш удаюцца Р. Сароку вершы, напісаныя на канкрэтную тэму або прысвечаныя пэўнай падзеі, выпадку, якія мелі месца ў жыцці аўтара ці блізкага яму чалавека. Цікава гучыць твор, прысвечаны Бялынічам. Па сутнасці, Р. Сарока ўзнаўляе гістарычную легенду, паводле якой на рацэ Друці было заснавана паселішча манахамі, якія вымушаны былі ў далёкія часы бегчы з Дона, шукаць сабе прытулак у вярхоўях Дняпра.

Канечне, ён не імкнуўся са скрупулёзнай дакладнасцю апісаць падзею, ён толькі адштурхнуўся ад гістарычнага факта. Астатняе — фантазія аўтара, якая лучыць у адно цэлае мінулае і цяперашняе: "На виду у берез и сосенок... разрастался наш с вами поселок, что стоит по сей день на Друти".

Напэўна, вакол вёскі, дзе нарадзіўся паэт, вельмі прыгожыя краявіды, лясы і пералескі, пожні і лугі, словам, цудоўная прырода, якая аказала на яго чарадзейнае ўздзеянне. Р.Сарока малюе яе яркімі штрыхамі надзвычай выразна і запамінальна. Каго не зачаруе, не заварожыць карціна зімы, якая падаецца не статыстычна, а ў руху: "О, январь — отличный пахарь! Перепахивает край, и не снег, а чистый сахар, хоть бери и продавай!". Здаецца, параўнанне снегу з цукрам паэт падслухаў недзе ў роднай вёсцы, нагэтулькі яно дакладнае, па-народнаму трапнае і каларытнае.

Аўтара цікавіць не толькі прыгажосць зімы, але і тое, што адбываецца ў вёсцы, чым яна жыве і што хвалюе сельскіх жыхароў. Апошняе ці не самае галоўнае. Р. Сарока гаворыць: "За последние полвека так, как нынче не мело. А село без дровосека, без хозяина село...». Паэт ведае, што апошнія сельскія жыхары — дзядулі і бабулі: "Много снега — много хлеба... А деревня, как в аду... Не щадит деревню небо, наметает снег беду». Лепш, здаецца, нельга сказаць пра становішча сучаснай вёскі.

Паэт умее намаляваць карціну прыроды, вясновага і гарадскога побыту, перадаць двума-трыма крэскамі стан чалавечай душы, элегічны настрой. У зборніку Р. Сарокі "Нежность и грусть" нямала паэтычных залацінак і крупінак, якія радуюць не толькі вока, але і душу, прыносяць пэўную эстэтычную асалоду і задавальненне.

Васіль МАКАРЭВІЧ

Новую публіцыстычную кнігу ***Пятра Прыходзькі "На хвалях часу"*** складаюць яго ўспаміны пра выдатных беларускіх пісьменнікаў, з якімі аўтар быў у шчырых сяброўскіх адносінах. Чытач можа даведацца пра цікавыя факты з біяграфіі самога П.Прыходзькі, а таксама А.Куляшова, М.Танка, П.Панчанкі, А.Астрэйкі і іншых літаратараў.

Раман ***Алеся Наварыча "Літоўскі воўк"*** — вострасюжэтны твор, прасякнуты духам авантурызму і ўзбагачаны любоўнай, рамантычнай інтрыгай, які запрашае чытача вярнуцца да паўстання 1863 — 1864 гг.

Алег САЛТУК

Я толькі тут шчаслівы

Запавет

Сей зерне з раніцы, і руцэ да вечара
не давай адпачываць.
Эклезіяст

Араў і сеяў, пот сціраў,
І ведаў, як смыляць мазолі.
А ў перапынках верш пісаў
Аб долі нашай і нядолі.

Жаў жыта на галодны рот,
Стаялі копы,
як салдаты.
Быў ураджай і недарод,
Ды у гэтым верш невінаваты.

Смяяўся ён з маіх вачэй,
З душы маёй сцякаў слязою.
ТУДЫ — паспееш.
Жыта сей.
І слова матчына святое.

На вейцы веку

Жыву паэзіяй і прозай,
Імкнуся з цемры на святло.
А новы век — чужак варожы
Прыйшоў аднекуль з новым злом.
Што пераможа?
Існы Божа,
Дапамажы мне светла жыць!..
Сляза маўкліва і трывожна
На вейцы веку зноў дрыжыць.

Тут

Зямля мая такая,
І больш няма другой:
Прачыстая, святая
І летам, і зімой.

Тут вечарам над ганкам,
Над кожнаю вярстой —
Зарніцы і заранкі,
І знічак цэлы рой.

"Здароў" сусед суседу
Не праміне сказаць,
І радасці і беды
Так, як свае, прыняць.

Яна адна ў нас, людзі,
Адна ў мяне і ў вас.
Памірыць і рассудзіць,
І дасць на ўсё адказ.

Над возерам і нівай —
Вясёлкі абярог.
Я толькі тут шчаслівы,
Шчаслівы, далібог!

Прызнанне

— Радзімы многа не бывае —
Мне шэпчуць спелыя бары.
— Радзімы многа не бывае, —
Мне сонца промні шле з гары.
— Радзімы многа не бывае, —
Мне верабей, і той пяе...
Радзіма тых не праклінае,
Радзіма сумна ўспамінае
ўсіх, хто адрокся ад яе.

Нам дваім

Да болю аж, да нематы
Душа трывожная кружыла.
— Жыць не хачу, — сказала ты, —
Не страшна мне ўміраць, мой мілы...

О, не:
Жыць трэба нам і ўсім,
І нават тым, хто ўжо не можа.
Няхай з табою нам дваім
Пражыць малітва дапаможа.

Не нам з табою вырашаць,
Калі, каму памерці трэба.
Глядзі, як лебедзі ляцяць —
Ажно святлейшым стала неба.

Пра лістапад шуміць лісцё,
Пасеяна, ўзыходзіць жыта...
І ў нас наперадзе — жыццё,
Хоць бальшыня яго й пражыта.

Эцюд

Вочы патухаюць у зары
Хваля з хваляй павяла гаворку.
Выйшлі на свой подыум стары,
Як нявесты, прыгажуні-зоркі.

О, якія розныя яны,
О, якая таямніца дзіва!
Андрамеда сцеліць туманы
І згараюць знічкі палахліва.

Не чуваць нічога анідзе,
Цішыня — на сто гадоў наўкола.
Маладзік у зорнай чарадзе,
Ажно ззяе, як жаніх вясёлы.

Ясенінскі матыў

Я не быў ніколі на Гаваях,
Не пытайся ты ў мяне пра іх.
Ты мне тут патрэбная такая,
Нібы выдых кожны мой і ўздых.

На Гаваях — мора і какосы.
Ні бярозкі там, ані сасны.
Тут жа ў нас —
вясёлыя пракосы,
У якіх нам родны пах зямны.

Не пабегчы мору там нікуды,
Як у нас гарэзным ручаям...
Салаўіным, непаўторным цудам
Прыляцела ты,
любоў мая.

Мне, павер, без краю, дарагая,
Мора хопіць у вачах тваіх.
Я не быў ніколі на Гаваях,
Не пытайся ты ў мяне пра іх .

Сляпы дождж

Яшчэ далёка быў няўклюдны гром,
Яшчэ вастрыў ён рэзкія маланкі.
І раптам пасвятлела
ўсё кругом,
І дождж сляпы залапатаў
на ганку.

Бо ведаў, што жаданым будзе ён,
Што прымуць яго нават
і сляпога,
І так сухмень стаяла многа дзён,
Вятрамі падмятаючы дарогу.

Вясёлкі каляровае крыло
Над возерам павісла
і над пушчай.
І сонца ўсю прастору заліло,
І дождж пайшоў сляпы,
нібы відушчы.

Віктар БУБНАЎ

Восень

Спадаючы, кружыцца восені
жоўтае лісце,
Ды зможа на дрэвах другое
вясной адрасці.
Я знаю,
гады, што згублю
неспадзеўна калісьці,
Не вернуцца ўжо да мяне аніколі
ў жыцці.

У чырвані ззяе дубоў і бярозак лістота,
Мой век чалавечы —
як дрэва пажоўклае ёсць...
Хай лісце згарае ў вялікім агні
пазалоты,
У полымі часу згарэла
мая маладосць.

А голыя дрэвы дарэмна глядзяць
у нябёсы —
Не хутка вясна маладая
да іх дабрыдзе...
Вось і прыйшла на зямлю
зноў тужлівая восень,
І з дрэва жыцця незваротна
мой год ападзе...

Світанак малюе...

Якое прыйшло нечакана здзіўленне.
Акідваю вокам усё навакол,
Дзе ў першых жаданых
і зыркіх праменнях
Світанак малюе нябачнай рукой:
Блакіт незабудак над роднаю вёскай,
І ружа зары распусціла пялёсткі...

Я помню заўсёды карціну такую,
Ды толькі ўспрымаю
нібы ўпершыню.
І зноў мне світанак паціху малюе
І той небасхіл, і нябёс вышыню:

Блакіт незабудак
над роднаю вёскай,
І ружа зары распусціла
пялёсткі...

На рыбалцы

Зрабіў світанак зыркі ўзлет:
Былі спачатку толькі блікі,
Ды разгарэўшыся, усход
Ужо кастром гарыць вялікім.

Гарыць, здаецца, і рака.
Але вада вадою будзе,
Калі ў паглядзе рыбака
Ляску далей пускае вуда...

Няхай плюскоча акунёк,
На сушы хваляцца уловам.
Нібыта лёгкі паплавок,
Усплыў шар сонца да паловы...

Свой паплавок, рыбак, вартуй!
Хвала, калі ў цябе ёсць вера,
Што сом пудовы клюне тут...
Але — ці выцягнеш на бераг?

Галубы

— Вуль-вуль, —
заву ізноўку галубоў,
А гэтыя даверлівыя птахі
Злятаць зусім не хочуць сёння
з даху,
Варкуючы шчасліва пра любоў...

Ды можа неспадзеўным быць узлёт.
Але, відаць, хвіліна ўжо не тая,
Бы першы вораг іх —
драпежнік-кот
На галубоў увагі не звяртае.

Заступнікам я іх імкнуся стаць,
Калі прыгожых птушак слаўлю
ў вершы...
Не могуць галубы не варкаваць,
Сваіх галубак радасна сустрэўшы.

Матчыны кветкі

Яна заўзятай кветніцай была,
Хоць, можа, і не думала аб гэтым.
Але, нібы руплівая пчала,
Бывала, завіхалася ля кветак...

Успомніцца — гляджу бы
з-пад рукі —
Мне ружа ў ціхім кветніку густая.
Дзе рук яе пяшчотных
матылькі
Да новай кветкі
лёгка узлятаюць...

Букецік свой дакладваю і я,
Каб потым ёй сказаць:
— Дару, матуля...
— Ах, ты, дзіцятка,
кветачка мая! —
І да грудзей мяне
яна прытуліць...

Фота В. КАВАЛЁВА

Хвалі. Бязмежная плынь...

Апавяданне

Алесь БЫЧКОЎСКІ

Хвалі тлустыя, нібы слаёны здор. Чорныя, як змрок начы.

Ветру няма, таму хвалі разыходзяцца канцэнтраванымі коламі. Яны марудныя. Здаецца, ледзь гойдаюцца.

Брудныя бурбалкі, чмякаючы, лопаюцца. Напаўзаюць іншыя хвалі.

Гэткі кісель поўніцца жыццём. Нікчэмная дробязь гушкаецца на паверхні вады, нібы на арэлях. Спяшаецца па сваіх мітуслівых справах.

Тутэйшым насельнікам хвіліна — цэлы век.

Ім не зразумець, што гэта Янусь зараз назірае зверху і шпурляе раз-пораз каменьчыкі. Абуджае гэты вадзяны кісель ад спячкі. Калыхае балота — свет бязмежны і неспазнаны для іх і нікчэмны для людзей.

Прынамсі, а каб ведалі, што б змянілася? Шпурнуты каменьчык ужо ляціць і абавязкова грымнецца.

Янусь шпурляе апошні галяш і падаецца прэч. Паверхню чорнага возера яшчэ доўга цярэбяць хвалі.

● Янусь — пісьменнік, а не графаман, ды яшчэ і не профі. Хутчэй, аматар. Іншым словам, — графаматар.

Ён марыць аб ганарарах.

Ён шукае натхненне.

Натхненне чамусьці паварочваецца да Януся зусім не прывабным месцам. Так бывае амаль з усімі, хто верыць у натхненне, а не ў цяжкую разумовую працу.

Янусь-графаматар блукае прыгожым летнім днём па лесе. Адпачывае на возеры-балоце. Разважае пра сэнс жыцця і вечнасць. (Што, прынамсі, з'яўляецца належным заняткам пісьменніка). Калі мы прыслухаемся да Янусевых думак, упэўнімся ў ягоных здольнасцях філосафа.

Шкада, што філосаф яшчэ не ведае, што сёння вечнасць абрала яго напісаць нізку радкоў пра... вечнасць.

Выпадкова ці не, але Янусь заўважыў пры дарозе чырвоную цагліну, невядома кім згубленую ці пакінутую. Філосаф чамусьці падабраў яе і потым заўважыў, што непадалёку нядаўна палілі вогнішча. Прысеў побач на стары пень. У задуменні акінуў вокам вуголле, абпаленыя шклянкі.

Натхненне так і не з'явілася.

Янусь пакалупаўся ў рэштках вогнішча, знайшоў іржавы цвік і нашкарабаў на цаглянай паверхні «Дзе ты?». Потым размахнуўся і што стае моцы шпурнуў цагліну далей ад сябе.

Некалькі цяжкіх уздыхаў каб супакоіць нервы...

Пасля падаўся дахаты.

● Лідуся адчувала хуткасць скурай, сэрцам, душой. «Дачка Шумахера». — Заўважалі калегі па бізнесе. Калі не чула, яе так і звалі — Лідуся-Шумахер. За прагу да аўтамабіляў і вар'яцкага спорту — аўтагонак. Сябры дарылі Лідусе новенькія машыны, якія яна шанавала больш за норкавае футра.

Лідуся лічылася персонай нон-грата. Аднойчы выскачыўшы замуж за шчырага тыпа па мянушцы Генерал, Лідуся не памылілася, бо хутка зрабілася ўладальніцай ультрасучаснай іншамаркі, банкаўскага рахунку і іншых атрыбутаў «новай рускасці».

Залішняй арыгінальнасцю ў жыцці Генерал не адрозніваўся. Хіба толькі меў іншую мянушку — Галава-тумба. У гэтай галаве часцяком варушыліся думкі, якія аднойчы страшэнна не спадабаліся канкурэнтам па бізнесе. А час стаўся ліхі, непрадказальны, пасля перабудовы, і Галава-тумба неўзабаве скацілася з шыі Генерала. Такім чынам Лідуся зрабілася адзінай уладальніцай генеральскіх капіталаў, завяла маладых палюбоўнікаў і прыдбала калекцыю спартыўных машын. Асаблівую перавагу аддала марцы «Ягуар», як раз той мадэлі, што на першай перадачы рухаецца не ніжэй за семдзесят кіламетраў у гадзіну.

Зразумела, жыццё зрабілася яшчэ больш насычанае чым раней. Лідуся ўзбілася на алімп чалавечай славы. Золата, брыльянты, натоўпы прыхільнікаў, салоны мод — банальна і звыкла, надакучліва. Жанчына забылася, што некалі пачынала звычайнай настаўніцай японскай мовы ў прэстыжнай гімназіі, куды трапіла пасля іняза. Прынамсі, гэта і не трэба было ёй.

Марыла Лідуся-Шумахер аб іншым: выехаць за мяжу, пабудаваць вялікі дом на беразе акіяна, адкрыць сетку бутыкаў, бараў. Знайсці мужа-мільярдэра. Вось тады і пачнецца сапраўднае жыццё. Так думала яна.

Але не заўсёды так бывае. Людзі не заўважаюць, як жыццё паступова ператвараецца ў бясконцы пякельны танец. Ілюзорнае ім здаецца сапраўдным, сапраўднае ілюзорным. І пакуль расплываецца розум у неабсяжных плынях бязмежных мар, усё раптам становіцца на сваё месца. Нібы падае камень на галаву.

Але гэта быў не камень.

Гэта аказалася цагліна.

Тым днём, калі небарака-графаматар Янусь вяртаўся з возера, на якім збіраўся знайсці і стрыножыць Пегаса, Лідуся-Шумахер ляцела на сваім гіпердарагім «Ягуары» ў сталіцу.

Чырвоная цагліна з надпісам «Дзе ты?» ляжала на дарозе. Яна была апошняй, што Лідуся ўбачыла пры жыцці. У жанчыны проста не хапіла часу збочыць. На хуткасці паўтары сотні кіламетраў у гадзіну «Ягуар» натыкнуўся правым колам на цагліну і ўзляцеў птушкай у паветра, хістануўся ўбок і ўлупіўся ў лясны гушчар.

Такім чынам, цагліна, аб існаванні якой Лідуся не ведала на працягу жыцця, развеяла ілюзіі маладой жанчыны наконт светлай будучыні.

● У аперацыйнай ішла барацьба. Бой не дзеля славы, дзеля жыцця.

— Цяжка, —заўважыў Міклуш, штукуючы скальпелем.

Малады хлопец-асістэнт моўчкі згадзіўся. Пацыентка, што ляжала на стале, шанцаў не мела. Пералом чэрапа, некалькіх рабрын, парушэнні шыйных пазванкоў, балявы шок у дадатак — усё сведчыла аб немінучай хуткай гібелі.

Такіх пацыентаў звычайна на стол не клалі. Карысці ні хвораму, ні ўрачам. Раненні не сумяшчальныя з жыццём. І кропка.

Але пацыентка мела сяброў. А сябры мелі грошы і ўплывовыя сувязі. Сябры патрабавалі зрабіць усё магчымае і немагчымае, каб пацыентка выжыла.

— Прыгожая яна, зараза, — Прамармытаў Міклуш.

Асістэнт згадзіўся.

— Падай зажым... Так...

Міклуш дзівіўся, што пацыентка яшчэ дыхае. Пасля падобных аварый людзі, як правіла, гінуць на месцы.

Як тлумачылі сябры жанчыны, машына саскочыла ў абочыну, зрэзала некалькі маладых дрэўцаў і ўпялася ў досыць аб'ёмістую сасонку.

Адзінае, што мог зрабіць Міклуш, сабраць па часцінках заднюю частку чэрапа і зашыць, каб сябры пацыенткі не хваляваліся.

— Закон бутэрброда — падаць маслам уніз,— працягваў хірург. — Чаму калі дрэва падае падчас аварыі, дык абавязкова на месца вадзіцеля?

— Сапраўды шкада маладзіцу. Жыла б, дзяцей гадавала.

— Ніколі не ведаеш, адкуль што звалiцца на галаву.

Міклуш наклаў апошні шоў. Задумліва паглядзеў на жанчыну. Эх, каб не дурная аварыя... Пры іншых абставінах ён бы абавязкова прапанаваў ёй сустрэчу.

Бландзінка. Стройная. Прыгожая.

Сэрца пацыенткі трапянулася і замерла.

Сустрэча адмяняецца.

● Вечарам Міклуш вярнуўся дадому. Усеўся на канапу, уключыў тэлевізар. З галавы не выходзіла аперацыя. У Міклуша быў адзіны шанц выратаваць нябожчыцу. Ён скарыстаў мажлівасць, але... «Чаму заўжды здараецца ТАК?».— ледзь не выкрыкнуў Міклуш. Ды адказу не знайшоў. Увайшоў Янусь. Павітаўся.

— Як прайшоў дзень, брат? -- задаў ён пытанне, усеўшыся побач.

І тады Міклуш усё расказаў: і пра аперацыю, і пра пацыентку, і пра яе сяброў, і пра прыгажосць маладых дзяўчат, і пра тое, як цяжка, калі атрымліваецца бязглуздзіца ў жыцці — смерць надыходзіць так неспадзявана і непрыкметна, як сёння. Быццам і паратунку ад яе нідзе няма.

— Іранічная сарцавіна сітуацыі — на дарозе ляжала цагліна. — Прыкра прамовіў Міклуш. — Уяўляеш, Янусь? Сябры маёй пацыенткі-нябожчыцы распісалі ў дробязях аварыю. Нейкі дурань пакінуў на дарожным палатне цагліну. Чырвоную, звычайную. Уяўляеш, брат? Хіба гэта не абсурд?

Янусь нічога не адказаў. Ён намагаўся схаваць узніклую занепакоенасць. Нейкая сіла сціснула грудзі. Раптоўна прымроілася лясное возера-балота з горкай паверхняй, якая гойдалася канцэнтраванымі коламі-хвалямі.

Ён падняўся з канапы і пасунуўся ў свой пакой, не разумеючы ўласныя душэўныя пачуцці. Мо гэта і называецца натхненнем?

Янусь уключыў камп'ютэр...

● «Труна — 5000 долараў, месца на могілках — 200, жалобны стол — 1000, арэнда памяшкання — 70...», — вусны таўстуна ў шыкоўным чорным гарнітуры зашавяліліся ў аб'ектыве, і Андрэй пстрыкнуў «Кодакам».

«Жывуць жа людзі», — падумалася фатографу, спецыяльна запрошанаму здымаць пахаванне Лідусі.

Ён перавёў камеру ў бок гасцей, зафіксаваў накрыты стол і пачаў «шукаць твары».

Кадры атрымліваюцца не штучнымі, калі ніхто не звяртае ўвагі на фотамастака. Тады ў здымках ёсць сіла, яны жывуць.

Андрэй любіў сваю справу і зарабляў ёй на жыццё. Вяселле, хрэсьбіны, хаўтуры — усё распісвалася па сюжэтах. Даўно вядомых, звыклых.

Андрусёва камера няўмольна фіксавала ўсе праявы чалавечай душы — пакуты і боль, смутак і журбу, каханне і шчасце, любоў і радасць.

А паміж кадрамі Андрэй «шукаў твары».

Яго цікавілі эмоцыі. Сапраўдныя пачуцці, не прыкрытыя маскамі абавязковасці.

Паміж пстрыкамі хаваюцца сапраўдныя чалавечыя твары. Іх Андрусь здымаў выключна для сябе, уласнай калекцыі. І часцяком бачыў у аб'ектыве больш за іншых людзей.

● Вольга — бліжэйшая сяброўка няшчаснай Лідусі, сядзела быццам накрухмаленая. Бледная, нібы з фарфору. Страшэнныя цені пад вачыма. Яна адрознівалася ад нябожчыцы толькі тым, што зрэдку варушылася — раз-пораз вынімала цыгарэты з мятага пачка «Салем» на стале і курыла бясконца доўга, быццам сабралася перавесці на свеце ўвесь тытунь. Дзіўная рэч — Вольга не міргала. Ашклянелымі вачыма ўнурылася ў бясконцасць. Нягледзячы на летнюю пару, ад Лідусінай сяброўкі патыхала арктычным холадам. Прычым з такой сілай, што Андрэю здалося — запацеў аб'ектыў.

Ён доўга і ўважліва разглядаў незвычайную госцю пахавання. Дзякуючы Вользе, у Андрэя з'явілася нечаканая ўпэўненасць, што колер сапраўднай жалобы менавіта белы, арктычны.

Лёд, холад, смерць... І мурашы па спіне. Андрэй скалануўся.

Няўмольная Вольгіна «мармуровасць» аднак здавалася незвычайна прыгожай. Праўда, гэта прыгажосць зусім не тая, што кажуць «выратуе свет». «Не, яе прыгажосць хутчэй свет пахавае»,— вырашыў Андрусь.

● Паміж імі ўзніклі пачуцці. Андрэй быў проста ўпэўнены. Штосьці павінна адбыцца. Штосьці звязала яго, звычайнага фатографа і Вольгу там, у рэстаране. Хоць яны і не размаўлялі, не абменьваліся поглядамі, зусім не знаёмыя, але штосьці звязала іх у адзіным эпізодзе, кадры, імгненні вечнасці.

Хлопец быў больш чым упэўнены, што яшчэ сустрэнецца з Вольгай. Прадчуванне такое...

Паміж фотасесіямі Андрэй «мастачыў». Істотнага падзаробку гэта не прыносіла ў адрозненне ад здымак, таму мастацкай справай хлопец займаўся дзеля душэўнай раўнавагі, унутранага спакою. Маляваў заўсёды па заказах царкоўнага пастара. Аздабляў інтэр'ер малітоўных дамоў, нядзельных школ. Час ад часу прэзентаваў уласныя карціны братам па веры. Ён быў баптыстам. Так, насамрэч сапраўдным вернікам евангельскім. Ні больш ні менш.

Андрэевы карціны адрознівала прастата. Выкананыя на евангельскія тэмы малюнкі былі ненадакучлівымі і зразумелымі як само хрысціянскае вучэнне. Вось сейбіт кідае зерне, апосталы цягнуць сетку з рыбай, Хрыстос крочыць па вадзе, а мытнік ускараскаўся на самае высокае дрэва, каб убачыць прыход Збавіцеля. Усё спрошчана і шчыра, ад сэрца.

Андрэй маляваў натхнёна. Калі натхненне не надыходзіла — не маляваў. Чакаў свайго імгнення.

● Сёння Міклуш адразу дамой не пайшоў. Падаўся ў гарадскі парк. Доўга назіраў за дзецьмі, што насіліся на каруселях. Іх звонкія галасы і смех расслаблялі, прымушалі прыгадаць уласнае дзяцінства. Міклуш набыў квіток і сам сеў на карусельнага коніка.

Конік аказаўся пашэрпаны і ярка-чырвонага колеру.

Карусель закружылася ў неверагодным танцы, напоўненым дзіцячымі віскамі.

Міклуш раптам зразумеў увесь камізм сітуацыі і закалаціўся ад рогату, нібы псіхічна-хворы.

Урач раённай бальніцы, вядомы ў рэгіёне хірург, паважаны чалавек, салідны, імпазантны мужчына і на табе — лётае на дзіцячай каруселі з партфелем у руках.

Калі карусель спынілася, ён заўважыў знаёмую постаць у дарагім чорным касцюме. Міклуш пазнаў не адразу, хто перад ім, а калі пазнаў, пасур'ёзнеў. Гэта быў чалавек з багатых сяброў пацыенткі, якую днямі ў агоніі прывезлі пасля аўтааварыі, і якую ўжо на аперацыйны стол паклалі толькі дзеля сумлення.

Міклуш спыніўся. Мужчына акінуў хірурга поглядам з ног да галавы. Здаецца, намагаўся пазнаць. Але тут з каруселі да мужчыны падбегла дзіця, і яны ўзяўшыся за рукі пакрочылі да выхаду, дзе чакала шыкоўная аўтамашына.

Міклуш глядзеў услед, пакуль аўтамабіль не знік з вачэй.

Палёгка аказалася часовай.

Праз рукі Міклуша праходзіла шмат розных хворых. Але вось тая, што загінула ў аўтакатастрофе, не выходзіла з галавы. Маладая, прыгожая, у самым саку. Гэта і псавала настрой.

«Дзе Боская справядлівасць?» — ледзь не ўскрыкнуў Міклуш і раптам спыніўся. Нібыта зверху пачуўся голас «А хто ты?».

Міклуш патрос галавой. На галюцынацыі раней хірург не пакутаваў, на шызафрэнію таксама. Ён азірнуўся і вырашыў, што падалося.

Голас не знік, а ласкава-лагодным тонам пачаў пытацца, ці жыве свет па Боскіх законах? І сам Міклуш кіруецца ў жыцці святымі запаведзямі? Голас настойліва прасіў прывесці хоць адзін прыклад.

Міклушу зрабілася страшна.

Неўзабаве ён спыніўся перад прыгожым будынкам, выкладзеным з чырвонай цэглы. На ўваходзе быў намаляваны крыж, а на дзвярах вісела шыльда «Царква евангельскіх хрысціян баптыстаў».

Міклуш зрабіў некалькі глыбокіх уздыхаў. Раптоўна захацелася некуды схавацца.

І ён нясмела адчыніў дзверы...

● Пятнічным вечарам, калі ў баптысцкім малітоўным доме адбываюцца набажэнствы, Андрэй зазбіраўся ў царкву.

У малітоўным доме ён з палёгкай усміхнуўся. На бялюткай сцяне пад самай столлю віселі літары «Бог ёсць Любоў». Наблізіўся пастар — саракагадовы мужчына ў акуратным касцюме і з лагодным тварам.

Яны павіталіся.

— Памятаеш, казаў пра дачку школьнага сябра, якая афармляе камерцыйныя вітражы? Яе рук справа.

— Здагадаўся, — адказаў Андрэй. — Рука прафесіянала бачыцца адразу.

— Таленавітая дзяўчына. Вельмі таленавітая, — запэўніў пастар. — Шкада, днямі з'язджае за мяжу, у Еўропу.

— Нічога не папішаш, — развёў рукамі Андрэй.

З-за спіны нехта падышоў.

— А вось і яна, — усхапіўся пастар. — Андрэй, пазнаёмся.

Андрэй азірнуўся на запрашэнне пастара і ледзь не абамлеў.

— Волечка, гэта наш мастак, — звярнуўся пастар да дзяўчыны.

У Андрэя затахкала сэрца, і ён адчуў, што пачырванеў.

Перламутравыя рукі, мармуровы твар, крышталёвыя вочы і ў іх арктычны лёд. Тая самая дзяўчына з хаўтур новай рускай.

Андрэй нясмела падаў руку.

Далонь Вольгі была на дзіва сухой і гарачай.

— Паразмаўляйце, пакіну вас, — з гэтымі словамі пастар павярнуўся да нейкай бабулі.

Яны моўчкі селі.

— Ведаеце, а я вас памятаю,— першай пачала размову Вольга.

Яна нечакана паклала далонь на руку Андрэя.

— Маўчыце. Не кажыце ні слова, — прашаптала Вольга. — Лідуся была самым блізкім для мяне чалавекам... Вы так пільна разглядалі мяне на той вечарыне... Вас здзівіла, што са мной за вечар ніхто не перамовіўся словам... Я бачыла выраз вашага твару.

Яна з горыччу ўсміхнулася.

— Вы даследчык, Андрэй. Я не памыляю-

(Працяг на стар. 14)

Арт-палічка

Гадоў дваццаць таму, калі беларускае музыказнаўства развівалася без праўдзівай і поўнай гістарычнай асновы, пра такія выданні мы і марыць не маглі. На пачатку 90-х, калі супраць фактаў забыцця і фальсіфікацыі айчыннай гісторыі, супраць штучных абмежаванняў памяці пра багаты і старажытны еўрапейскі радавод беларускай мастацкай творчасці паўстаў жыватворны

дух нацыянальна-культурнага адраджэння, пра такія выданні мы маглі ўжо марыць ... і толькі. А сёння яны спраўна папаўняюць нотныя паліцы, дапамагаюць пашыраць і ўпарадкоўваць, сістэматызаваць нашы ўяўленні ды веды пра беларускую музычную спадчыну, пра вытокі традыцый прафесійнай творчасці.

Новы набытак — хрэстаматыя па курсе "Гісторыя музычнай культуры Беларусі да XX стагоддзя", выдадзеная ў двух ёмістых нотных сшытках: "Музыка Беларусі эпох Сярэдневякоўя і Рэнесанса" ды "Музыка Беларусі эпохі Барока". Доктар мастацтвазнаўства Вольга Дадзіёмава, складальнік і аўтар уступных артыкулаў да хрэстаматыі, прадставіла на яе старонках разнастайны матэрыял. Песняспевы пра Еўфрасінню Полацкую, малітвы з Берасцейскага канцыянала; хоры Цыпрыяна Базыліка і Вацлава з Шамотул; п'есы лютністаў Войцаха Длугарая і Дыямеда Като; фрагменты з Імшы Жыгімонта Ляўксміна; калядныя, лірычныя ды жартоўныя канты... Нават выбарачны пералік нотных тэкстаў дае ўяўленне пра багацце і своеадметнасць нашай музычнай спадчыны. У адным з уступных нарысаў-аглядаў В.Дадзіёмава зазначае: "У цэлым па накіраванасці і асноўных стадыях руху (Сярэдневякоўе, Рэнесанс, Барока) развіццё айчыннай музычнай культуры як гісторыка-стылявога працэсу супадае з агульнаеўрапейскім. Аднак змястоўнае напаўненне і канкрэтныя формы праяўлення пэўных еўрапейскіх і агульнаславянскіх традыцый мелі ў музычнай культуры Беларусі ўласную спецыфіку. Арганічна і своеасабліва спалучыўшы розныя канфесійныя, этнічныя, музычна-стылявыя плыні, вылучыўшы ўласныя спецыфічныя рысы, гэтая культура сфарміравала сваё непаўторнае аблічча. Яна аказалася вельмі самабытнай, але разам з тым адкрытай для плённага разнавектарнага дыялога з шырокім музычна-культурным светам".

Новая работа, выдадзеная пад грыфам Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, у пэўным сэнсе універсальная. Яна не толькі спатрэбіцца як вучэбны дапаможнік для студэнтаў вышэйшых і навучэнцаў сярэдніх спецыяльных устаноў адукацыі ў галіне культуры і мастацтва. Кароткія нарысы-агляды музычнай спадчыны адпаведных эпох у гістарычным кантэксце, звесткі пра кампазітараў надаюць выданню каштоўнасць пазнаваўчага даведніка. Выканаўцы ж могуць выкарыстоўваць нотадрук як унікальную крыніцу педагагічнага і канцэртнага рэпертуару.

С.БЕРАСЦЕНЬ

Фота забяспечана аўтарам

«Brevis»: ціхая музыка, гучныя поспехі

З творчасцю ансамбля старажытнай музыкі "Brevis" знаёмыя і філарманічныя слухачы, і наведнікі канцэртаў, праведзеных у межах праекта "Легенды Вялікага Княства", падчас "Лошыцкага фэсту", на фестывалі "Звіняць цымбалы і гармонік" у Паставах. Чым адметны "Brevis" сярод іншых калектываў такой жанрава-стылістычнай накіраванасці? Яго ўдзельнікі — навучэнцы мінскай СШ № 13 з музычным ухілам, а кіраўнік ансамбля Павел СУРАГІН — іх настаўнік па класе флейты. Сёння ён — наш суразмоўца.

— Першае пытанне да вас — пра гісторыю творчага станаўлення ансамбля...

— Ансамбль старажытнай музыкі "Brevis" быў створаны ў 1998 годзе. Менавіта тады мы пачалі рэпетыцыі. А ў 1999 годзе калектыў быў адзначаны першым у сваёй гісторыі дыпломам Мінскага гарадскога фестывалю мастацтваў.

Удзельнікі ансамбля — вучні класа флейты школы № 13 з музычным ухілам. Рэпертуару для блок-флейт, на якіх яны іграюць, не было ў прыродзе. Нам даводзілася ці выпукваць яго, ці інструментаваць для флейты творы, якія нам падабаліся. Цяпер колькасці п'ес, якія ёсць у нашым рэпертуары, з лішкам хопіць, каб наладзіць паўнавартасны канцэрт у двух аддзяленнях. Дарэчы, з такім канцэртам "Brevis" выступіў сёлета ў Малой зале філармоніі.

— Павел, пазнаёмце чытачоў з удзельнікамі вашага калектыву...

— Рэальна існуюць ужо два склады ансамбля старажытнай музыкі "Brevis": канцэртны склад і ансамбль малодшых школьнікаў. Канцэртны склад сёння — гэта Аляксей Ладзік (блок-флейта-сапрана), Марыя Астапенка (блок-флейта-альт), Аляксей Рэзнікаў (блок-флейта-бас), Вераніка Курэйчык (ударныя інструменты) і я, Павел Сурагін (блок-флейта-тэнар). Мая жонка Таццяна таксама з'яўляецца адным з кіраўнікоў ансамбля. Яна вядзе ў школе клас фартэпіяна і ў шэрагу твораў выконвае партыю клавесіна. Нам дапамагае арганіст і прафесійны кампазітар Віктар Кісцень.

— Удзел у айчынным і міжнародным фестывальным руху — адзін з прыярытэтаў вашай музычнай дзейнасці. У той жа час, фестывальныя паездкі немагчымыя без выдання сольных альбомаў — гэта ж візітоўка для кожнага калектыву. Як у вас: ці ёсць сувязь паміж выданнем альбомаў і ўдзелам у фестывалях?

— У нас такая тэндэнцыя прасочваецца на працягу ўсяго тэрміну існавання ансамбля. У 2002 годзе мы выдалі свой першы дыск (*на жаль, усе дыскі ансамбля безназоўныя. — А. М.*) з запісамі еўрапейскай музыкі для блок-флейт. "Brevis" пачаў набываць вядомасць, быў запрошаны на фестываль "Славянскі базар" у Віцебску" і стаў там сёлета ўладальнікам першай прэміі на конкурсе дзіцячых праграм.

У 2003 годзе мы выдалі свой другі альбом з запісамі старажытнай беларускай музыкі — інструментавалі для блок-флейты цэлы шэраг твораў кампазітара другой паловы XIV стагоддзя Войцаха Длугарая, які працаваў пры двары караля Стэфана Баторыя. У тым жа годзе "Brevis" браў удзел у фестывалі сярэдневечнай культуры "Старажытны Нясвіж".

— Наколькі я ведаю, з наступным альбомам вы прадстаўлялі старажытную беларускую і еўрапейскую музыку для блок-флейт на адным з буйных міжнародных фестываляў.

— Трэці дыск ансамбля "Brevis" убачыў свет у 2004 годзе. Яго праграма ўключала перапрацаваныя творы з папярэдніх альбомаў, а таксама сучасныя мелодыі Манчыні, Саймана, Балена. Гэтаксама летась наш ансамбль удзельнічаў у фестывалі-конкурсе старажытнай музыкі ў польскім горадзе-крэпасці Мальборк. Высакароднае гучанне блок-флейт было высока адзначана слухачамі і журы — ансамбль "Brevis" назвалі ў ліку лаўрэатаў. І гэта пры тым, што наш калектыў дзіцячы! Канкурэнцыю ансамблю складалі прафесійныя выканаўцы з Вялікабрытаніі, Польшчы, Германіі, Ірландыі. Мы ўпершыню выступалі на такім грандыёзным форуме, дзе большасць калектываў выконвала менавіта музыку для блок-флейтаў. А сёлета мы зноў узялі ўдзел у гэтым конкурсе і сталі ўладальнікамі Гран-пры! Ехалі сюды ўжо як знакамітыя музыканты, з чатырма сольнымі альбомамі ў сваёй дыскаграфіі. Чацвёрты дыск выйшаў якраз да нашай паездкі ў Мальборк. На ім запісаныя творы Гендэля і іншых вядомых кампазітараў, як еўрапейскіх, так і беларускіх. Некалькі кампазіцый мы запісалі сумесна з вакалісткай Тамарай Рэмез (сапрана). У гэтым годзе нашым юным выканаўцам не было роўных канкурэнтаў, што могуць пацвердзіць шматлікія беларускія музыканты і турысты, якія прысутнічалі на гэтым музычным свяце. А не так даўно "Brevis" вярнуўся з Паўднёвай Карэі, дзе прадстаўляў беларускую старажытную музыку на фестывалі з дзіўнай назвай "YoPeFe?005".

— Павел, а ці працягваецца школьны выхаваўчы працэс і ў канцэртнай дзейнасці калектыву?

— У калектыве мы імкнёмся падтрымліваць сяброўскія адносіны. Я б не сказаў, што яны складваюцца паводле формулы "вучань-настаўнік", хутчэй — "музыкант — кіраўнік калектыву". Юныя ўдзельнікі ансамбля пасталелі ўжо як музыканты. Гэта вынік таго, што ансамбль "Brevis" мае вельмі напружаную канцэртную дзейнасць. У нашым калектыве кожны музыкант мае права на ўласную думку і можа яе вольна выказваць. У нас бываюць моманты, калі перад самым выхадам на сцэну творы літаральна перарабляюцца наноў. Усялякая ініцыятыва ўспрымаецца з разуменнем, бо яна спрыяе фарміраванню музыканта як асобы. Настаўнікі ў школе лічаць, што заняткі ў ансамблі перашкаджаюць яго ўдзельнікам вучыцца. Але, як ні дзіўна, усе юныя музыканты ансамбля "Brevis" — выдатнікі вучобы! Бо ў нас вельмі жорсткія патрабаванні: рэпетыцыі адбываюцца амаль кожны дзень, і таму, перш чым прыйсці на іх, трэба падрыхтаваць школьнае хатняе заданне. Гэта дысцыплінуе дзяцей, робіць іх патрабавальнымі да сябе... Але ж дырэктар школы Рыта Шыбітава заўсёды ідзе насустрач музыкантам і мне як кіраўніку ансамбля дапамагае ўсім, чым магчыма: інструментамі, памяшканнем для рэпетыцый, касцюмамі. Я вельмі ўдзячны дырэкцыі школы № 13 за дапамогу ансамблю!

Гутарыў Анатоль МЯЛЫГУЙ

Фота забяспечана У.М.

Вяртанне з ПАРЫЖА

Пяць гадоў таму ў гістарычным кутку Мінска, у Верхнім горадзе, адкрыўся філіял Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі — музей-сядзіба "Дом Ваньковічаў". У гэтым будынку, звязаным з жыццём адметнай творчай асобы першай паловы XIX стагоддзя, нашага вядомага мастака Валенція Ваньковіча, узноўлена ўтульная рамантычная атмасфера тагачаснай сядзібы беларускіх дваран. У такіх сядзібах, як, вядома ж, і ў Ваньковічаў, добрай традыцыяй было хатняе музіцыраванне з удзелам сямейнікаў, суседзяў, сяброў. І сёння своеасаблівым працягам традыцыі салоннага музіцыравання з удзелам цікавых гасцей сталася правядзенне тут вечарын старадаўняга раманса, камерных канцэртаў.

Днямі музейны фонд "Дома Ваньковічаў" папоўся фотакопіямі карцін, лістоў, некаторых дакументаў, звязаных з парыжскім перыядам біяграфіі мастака. Яны і прыбылі ў нашу краіну з Парыжа — дзякуючы высакароднай місіі ды пошукавай працы беларускіх дыпламатаў, што ажыццяўляецца ў адпаведнасці з праграмай вяртання на радзіму каштоўнасцяў нацыянальнай культуры. Перадачу "парыжскай пасылкі" супрацоўнікам музея ажыццявіла жонка міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь Маргарыта Мартынава.

Даведнікі даюць не надта дакладныя даты жыцця мастака: 1799 (або 14.02. 1800) — 12.05.1842. Але ёсць безумоўная пэўнасць іншых фактаў: Валенцій Ваньковіч, ураджэнец Бярэзінскага раёна, чыё дзяцінства прайшло ў вёсцы Сляпянка паблізу Мінска, а студэнцкія гады — у Вільні і ў Пецярбургу (там ён прайшоў выдатную школу Акадэміі мастацтваў), жыў у Мінску, меў творчую майстэрню ў Сляпянцы... І як прадстаўнік рамантызму, аўтар партрэтаў А.Міцкевіча, С.Манюшкі, А.Гарэцкага, А.Пушкіна, іншых вядомых сваіх сучаснікаў, а таксама выразных жывапісных карцін, — увайшоў у гісторыю беларускага мастацтва.

Я.КАРЛІМА

ТЭАТР АДНАГО ДЫРЫЖОРА

Не крыўдуйце, спадары беларускія дырыжоры: такая рэальнасць... Маэстра Сасноўскі сярод сваіх таленавітых, артыстычных, тэатральных, непаўторных калег — унікум. Дырыжор-тэатр! Не дырыжор тэатра (хаця і гэта праўда), а дырыжор, які носіць у сабе Тэатр.

Яго тэатр, як і яго артыстызм, бывае розны. Акадэмічны і вытанчаны. І нястрымна-з'едлівы. Высакародны і стрыманы. І авантурна-неўтаймоўны. Праўдашукальніцкі. Парадыйны. Фарсавы. Летуценна-лірычны. Але заўсёды — музычны. Дарэчы, толькі той, хто нясе ў сабе Музыку і Тэатр, мог зладкаваць такую эмацыйна шчырую, кранальную і некрыклівую імпрэзу, што адбылася на яго роднай сцэне і сталася святам для ўдзельнікаў, для публікі, для самога маэстра. А прымяркоўваўся нядаўні бенефіс галоўнага дырыжора Беларускага дзяржаўнага музычнага тэатра Аляксандра Сасноўскага да яго 50-гадовага юбілею і 25-годдзя творчай дзейнасці.

Увесь вечар на сцэне былі аб'яднаныя ў адзінае цэлае два аркестры, аркестры двух тэатраў: Дзяржаўнага музычнага і Брэсцкага абласнога тэатра драмы і музыкі. Уявіце сабе: у абодвух калектывах юбіляр працуе галоўным дырыжорам! І гэта, пагадзіцеся, надзвычай яркі штрых, які характарызуе выдатную творчую індывідуальнасць маэстра Сасноўскага. Дарэчы, пра яго творчы шлях і творчы стыль, пра талент, глыбокую мастацкую эрудыцыю, неверагодную працавітасць і прафесійны азарт распавядала падчас вечарыны лектар-музыказнаўца Іна Зубрыч. Зразумела ж, чытачам "ЛіМа" гэтага дырыжора можна і не прадстаўляць. Хіба толькі нагадаць варта некалькі фактаў.

Яму пашанцавала на сапраўдных Настаўнікаў: Леанід Іваноў у Магілёўскім музычным вучылішчы; Іосіф Абраміс — у Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі; Ілья Мусін і Юрый Цемірканаў — у колішнім Ленінградзе. 16 снежня 1980 года стаўся днём, з якога А.Сасноўскі адлічвае гады сваёй творчай дзейнасці. Менавіта ў той дзень яму давялося, дзякуючы рэкамендацыі І.Абраміса, прадырыжыраваць спектаклем "Сільва" — экспромтам, без аніводнай рэпетыцыі, нават без партытуры — напамяць! Назаўтра яго прынялі ў тэатр. І з тых часоў многія значныя прэм'еры (дый ці не ўвесь рэпертуар — больш як тры дзесяткі спектакляў розных жанраў) у літаральным сэнсе прайшлі праз яго рукі. "Мільянерка", "Viva la Mamma!", "Цыганскі барон", "Клоп", "Даратэя", "Дон Кіхот"...

Восем гадоў таму ўзначаліў ён сімфанічны аркестр Брэсцкага абласнога тэатра драмы і музыкі (свае выхадныя аддае творчым вандроўкам са сталіцы туды, "на захад"). Больш за тое: маэстра сур'ёзна захоплены педагагічнай працай. І яе вынік уразіў прысутных на юбілейнай вечарыне: аб'яднаным аркестрам дырыжыравалі і герой урачыстасці, і яго выхаванцы.

На "капітанскім" подыуме змянялі адно аднаго вучні Сасноўскага (без малога дзесятак адметных творчых асоб). Сярод іх — і вядомы сёння ў нас ды за межамі Беларусі дырыжор Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы Вячаслаў Чарнуха (з нядаўняга часу выступае пад сцэнічным імем Вячаслаў Воліч). І дэбютантка музычнага тэатра Марына Траццякова...

Канцэртная праграма ўражвала разнастайнасцю. Гучалі, напрыклад, уверцюра-фантазія П.Чайкоўскага "Рамэо і Джульета", "Іспанскі танец" з балета А.Глазунова "Раймонда", песні, дуэты з класічных аперэт — "Сільва", "Баядэра", аркестравыя фрагменты з твораў Я.Штрауса і І.Дунаеўскага, з мюзікла "Нотр-дам дэ Пары". Быў у юбілейнай праграме унікальны нумар, выкананы хорам тэатра і аб'яднаным аркестрам: знакамітыя "Палавецкія скокі" з оперы А. Барадзіна "Князь Ігар"...

Доўга давялося б тут пералічваць і тых, хто спяваў або граў для юбіляра, хто віншаваў яго ад ад імя таго або іншага творчага калектыву. Гэта і выдатныя салісты: Наталля Гайда, Уладзімір Пятроў, Аляксей Ісаеў, Людміла Станевіч, Маргарыта Александровіч, Ніна Шарубіна, Зінаіда Вяржбіцкая, Герман Казлоў. І дырыжоры Пётр Вандзілоўскі, Рыгор Сарока. І купалаўцы Святлана Зелянкоўская, Мікалай Кірычэнка ... Намеснік міністра культуры Беларусі Валерый Гедройц уручыў юбіляру самую высокую галіновую ўзнагароду — Ганаровы знак міністэрства, начальнік упраўлення культуры Мінгарвыканкама Віктар Кураш — Ганаровую грамату...

Хтосьці ў той вечар не хаваў здзіўлення: чаму такі музыкант не мае нават самага сціплага ганаровага звання? Камусьці захацелася паслухаць яго ў філарманічнай праграме... А чаму б і не? У атмасферы свайго бенефіса маэстра стварыў захапляльны жывы тэатр гуку, дзеі, эмоцый. Нягледзячы на складаныя акустычныя ўмовы (ды і сцэнічныя: больш як тры гадзіны "адсідкі" ў публікі навідавоку!) вялікі зводны калектыў гучаў на дзіва збалансавана, дакладна, інтанацыйна выразна — і натхнёна. Устрымаемся ад прыгожых слоўных пасажаў наконт таго, як музыканты любяць або нават абагаўляюць свайго Сасноўскага. Галоўнае, што яны прымаюць яго. Значыць, паважаюць і цэняць як прафесіянала. Прыслухоўваюцца. А ў мастацтве, дзе суіснуюць, спрачаюцца, варагуюць, лагодзяць і гарманізуюць адно аднае Музыка і Тэатр, — гэта дарагога вартае.

С.БЕРАСЦЕНЬ

Фота Яся Кавалевіча

Карэспандэнт маскоўскага тэлеканала "Расія" Віктар Дзятліковіч прэзентаваў днямі ў інтэрнет-кавярні "Саюз-ONLINE" сваю новую кнігу "Іх МРОЯ. Іх N.R.M.". 400-старонкавае выданне цалкам прысвечана гісторыі станаўлення найвядомейшага беларускага рок-гурта.

Іх мроя пра N.R.M.

Незалежная Рэспубліка Мроя існуе на беларускай рок-сцэне ўжо больш як дваццаць гадоў; праўда, палову з іх удзельнікі гурту прайшлі пад сцягам "МРОІ". Сёння Лявон Вольскі ды сатаварышы маюць за плячыма больш за дзесяць студыйных альбомаў, падвоены акустычны live-CD, некалькі складанак і першы ў Беларусі сінгл. Больш за тое, хоць Лявон і скардзіцца на заўчаснае пахаванне N.R.M. на адным з беларускіх інтэрнет-форумаў, гурт цяпер вітаюць поўныя залы не толькі ў Беларусі, але і ў розных гарадах Польшчы ды Германіі.

Напярэдадні новага 2004 года Віктар Дзятліковіч завітаў у Мінск, захапіўшы з сабой дыктафон. Цягам тыдня ён сустрэўся з усімі энэрэмаўцамі, а таксама са "сведкамі тых часоў". Вынік тае вандроўкі — больш за 20 гадзін запісаў плюс "сканфіскаваныя" фота- і медыяархівы. Так усё і закруцілася; а праз паўтара года ў мінскім выдавецтве "Сучасны літаратар" накладам у 2000 асобнікаў пабачыла свет першая біяграфія беларускага гурту, якая пацвердзіла ягоны статус "жывой легенды".

— Болей увагі тут надаецца МРОІ, яно і зразумела: МРОЯ тая была так даўно, што некаторыя з музыкаў не памятаюць гарадоў і дат, а хтосьці нават забыўся на падзеі, — тлумачыць Лявон Вольскі. — Дзякуючы Віктару аднавіўся парваны ланцуг мроеўскага жыцця, і цяпер можна ўдыхнуць дзіўны водар, здаецца, блізкіх, але такіх даўніх гадоў. Гэткая машына часу...

Адметнасць кнігі ў тым, што ніхто з музыкаў не чытаў яе цалкам да афіцыйнага выхаду. Паводле слоў Віктара Дзятліковіча, удзельнікі N.R.M. былі азнаёмленыя толькі з невялікімі часткамі некаторых раздзелаў — для ўдакладнення спрэчных момантаў, звязаных з датамі ці нейкімі падзеямі.

— Сэнс быў у тым, каб ніхто з хлопцаў не стварыў перашкод для публікацыі той ці іншай інфармацыі, — тлумачыць аўтар кнігі. — Бо часцяком было так, што нехта, напрыклад, Лявон, не хоча распавядаць тую ці іншую гісторыю, а Юрась расказвае.

У Беларусі гэтае выданне можна набыць у кнігарнях, беларускамоўныя аматары гурту з-за межаў краіны маюць магчымасць дастаць яе праз Інтэрнет. У Расіі выданне распаўсюджваецца метадам "Прадае аўтар".

Як распавёў журналістам сп. Вольскі, у бліжэйшых планах гурту — выдаць адмысловы DVD-дыск з аматарскімі запісамі кліпаў, старых канцэртаў і іншых рарытэтаў, што маюць дачыненне да гісторыі рок-гурту. Магчыма, гэткі кампакт увойдзе ў якасці бонуса ў другое выданне кнігі.

Мікалай АНІШЧАНКА

Фота Паўла СВЯРДЛОВА

АБ'ЯВА

1. Установа адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі" аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад (да 5-ці гадоў) прафесарска-выкладчыцкага складу (для тых, хто мае мінскую прапіску) з далейшым заключэннем кантракту ў выпадку выбрання на тэрмін, вызначаны наймальнікам:

— кафедра музычнай педагогікі, гісторыі і тэорыі выканальніцкага мастацтва:
загадчык кафедры — 1

— кафедра камернага ансамбля:
дацэнт — 1

Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання.

Заявы і дакументы накіроўваць на імя рэктара на адрас:

220030, г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 30.

Даведкі па тэлефонах: 227-49-42; 226-06-70.

2. Філіял установы адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі" педагагічны факультэт у г. Магілёве аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад (да 5-ці гадоў) прафесарска-выкладчыцкага складу (для тых, хто мае магілёўскую прапіску) з далейшым заключэннем кантракту ў выпадку выбрання на тэрмін, вызначаны наймальнікам:

— філіял кафедры аркестравага дырыжыравання:
прафесар — 1

Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання.

Заявы і дакументы накіроўваць на імя рэктара на адрас:

212030, г. Магілёў, вул. Кірыленкі, 12.

Даведкі па тэлефоне: 8. 022-225-28-14.

Сённяшнія цацкі далёка не такія, якімі былі ў маё "савецкае" дзяцінства. На змену маўклівым пластмасавым салдацікам прыйшлі віртуальныя арміі, якія бездакорна выканаюць любы загад. З дапамогай камп'ютэрных гульняў з'явілася магчымасць пераносіцца праз час і прастору. Але што нясуць новыя магчымасці дзецям і дарослым, якія гуляюць у камп'ютэр не менш за сваіх дзяцей?

ГУЛЬНІ НОВАГА СТАГОДДЗЯ

Крышку гісторыі

Першым прадстаўніком-прататыпам камп'ютэрных забаў на Беларусі можна лічыць так званыя электронныя гульні, якія былі вельмі папулярнымі ў часы перабудовы і каштавалі звыш 20 рублёў, — пры сярэдняй зарплаце ў 100 з лішкам рублёў. Невялічкі экран, некалькі пампачак, своеасаблівы трэнінг хуткасці рэакцыі. Галоўныя персанажы — воўк з мультфільма "Ну, пачакай!", паляўнічы, капіталістычны Мікі Маус і іншыя... Тады такія цацкі былі сапраўднай навінкай, выклікалі хвалю першага буму. Потым іх змяніў папулярны тэтрыс... Зараз гэта не больш як лом ці музейны экспанат.

Праз які час з Кітая пачалі прывозіць прыстаўкі, якія падключаліся да тэлевізара, а відэагульні цэлымі зборнікамі памяшчаліся ў невялічкай плаце картрыджа. Пачалі прыходзіць стандарты дагані-забі-пераскокні. Памятаю, як і ў маёй сям'і нават дарослыя пулялі па качках у тэлеэкран са светавога пісталета, што ўваходзіў у камплект, як усхвалявана трэсліся рукі ад нечаканага з'яўлення новых ворагаў у тэлевізары...

Ды і гэтыя васьмібітныя і шаснаццацібітныя боксы пакрысе адышлі ў небыццё. Сёння ў Мінску яшчэ дзе-нідзе можна набыць картрыджы з гульнямі, толькі іх мала хто бярэ. Прагрэс крочыў наперад, кошт на старое катастрафічна падаў, а таму і прыстаўкі зараз максімальна адаптаваны па прадукцыйнасці да камп'ютэра, працуюць на кампакт-дысках свайго стандарту і па якасці калі-нікалі могуць нават апераджаць стандартны персанальны камп'ютэр.

Дарэчы, былі і так званыя міні-прыстаўкі, вельмі падобныя да тэтрыса па выглядзе , але па якасці — да стандартных прыставак. Нельга не ўзгадаць і бум з тамагочы, бірулькай-жывёлай, які працягнуў нядоўга, але свой след пакінуў.

У некаторых краінах свету ёсць цэнтры з гульнявымі аўтаматамі. У нас падобных — буйных — пакуль няма, а таму і буму не назіраецца... Калісьці, яшчэ пры СССР і ў нас былі аўтаматы, але яны кардынальна адрозніваліся ад заходніх, здаваліся нейкімі сваімі, роднымі...

Паралельна з вышэйпералічанымі, развіваюцца непасрэдна гульні для персанальных камп'ютэраў: на дыскетах, аўдыёкасетах, кампакт-дысках, з нядаўняга часу і на DVD. Але...

Такія розныя гульні

Тыя, што часцей за ўсё сустракаюцца ў нашых крамах, адрозніваюцца адна ад адной. Так, напрыклад, ёсць такія, дзе патрэбна бегчы па заладзеным маршруце і забіваць кожнага ворага на сваім шляху. Прычым іх столькі, што забава ператвараецца ў нейкую мясарубку. У некаторых патрэбна выконваць тыя ці іншыя заданні, выратоўваць свет ад нейкай навалы, пераносіцца ў разнастайныя гістарычныя эпохі. Можна неўзабаве зрабіцца байцом на рынгу і біцца-біцца-біцца... да страты прытомнасці. Ёсць такія, дзе вы будзеце кіраваць цывілізацыямі, заваёўваць гарады і склады з рэсурсамі, новыя землі і ўдасканальваць магчымасці свайго народа. У гульнях-сімулятарах ёсць магчымасць пакіраваць тэхнікай: танкамі, самалётамі, проста гоначнымі аўтамабілямі, спартсменам ці цэлым спартклубам, і нават пражыць сваё асобнае, віртуальнае, жыццё. Ёсць і такія, дзе патрэбна шмат думаць, разгадваць загадкі, сюжэтныя рэбусы і галаваломкі, якія накіраваны як на дзяцей, так і на дарослых. Чаго толькі ні прадстаўляе сёння свет камп'ютэрных цацак!..

Правілы гульні трэба ведаць, але лепш устанаўліваць іх самому.

Анджэй Сток

Каб даведацца, якія гульні зараз больш папулярныя, ператэлефанаваў свайму знаёмаму — вопытнаму рэалізатару са Ждановіцкага кірмашу.

— Часцей за ўсё купляюць хлопчыкам штосьці пра вайну, а дзяўчынкам — наадварот. Шмат гульняў набываюць людзі сталага ўзросту, – кажа ён.

Здаецца, нічога асаблівага. Але не ўсё так проста, як падаецца на першы погляд...

Псіхалагічны аспект

Само сабой узнікае пытанне: наколькі карысныя і патрэбныя камп'ютэрныя гульні? Вядома ж, яны нясуць вялікую псіхалагічную нагрузку.

Гульня захоплівае, і бывае, настолькі, што выключыць камп'ютэр і сказаць самому сабе "хопіць!" вельмі цяжка. Бо наперадзе — новыя ўзроўні, цяжкасці, ворагі, рэкорды. Новыя візуальныя эфекты і музыка, якая можа зацягнуць, нібы магнітам. Грукатанне нагамі падчас гульні, нейкія нервозныя выпады, якім псіхіатр змог бы знайсці сваё медыцынскае тлумачэнне. Калі вы перагулялі перад сном, то існуе верагоднасць таго, што віртуальныя баявыя дзеянні будуць працягвацца і ў сне. Апошняе асабліва тычыцца звышэмацыянальных дзяцей. Як крайнасць, ёсць верагоднасць развіцця камп'ютэрнай залежнасці. Праўда, калі глядзець адны толькі мыльныя оперы, таксама існуе верагоднасць падобнага нервовага захворвання. А таму не будзем абвастраць сітуацыю!

Калі хлопчык выдатна вучыцца, можа распланаваць свой дзень так, што часу хопіць на ўсё, чаму б не даць яму расслабіцца падчас гульняў на камп'ютэры. Толькі ў меру...

У азіяцкіх краінах час ад часу здараюцца вельмі драматычныя выпадкі. Напрыклад, адна маладая пара настолькі забаўлялася камп'ютэрнымі гульнямі, што проста забылася пра свайго малога, які неўзабаве памёр ад недахопу бацькоўскага дагляду.

Усё гэта аўтар дадзенага матэрыялу і сам прайшоў зусім нядаўна. Залежным ад гульняў не стаў. Проста з узростам кардынальна змяніліся жыццёвыя інтарэсы, а камп'ютэрныя гульні адышлі на апошні план... Але і сёння, чаго таіцца, пасля працы цягне сесці за штурвал вернага Як-1 і запаліць хвасты фашысцкім вырадкам. Ці "памахацца" на светавых мячах з цёмнымі рыцарамі-джэдаямі. Прасцей кажучы, адпачыць ад будзёнасці...

Іншая праблема ўзнікае пры адсутнасці камп'ютэра дома і прасаджванні бацькоўскіх грошаў у адпаведных клубах. Як хочацца яшчэ, хоць з гадзіну, паваяваць... за ці супраць тэрарызму. Ад гульні Counter-Strike ужо некалькі год літаральна "шызеюць" сотні і сотні беларускіх падлеткаў. І ніякія сацыяльныя педагогі пры клубах не дапамогуць. Некаторыя нават называюць гэта "камп'ютэрным спортам". А чаму не? Паляванне на жывёл — таксама для многіх — спорт. Ды толькі паляўнічыя забіваюць жывую істоту, а так званыя геймеры – свае віртуальныя ўвасабленні.

Дык ці трэба ім перашкаджаць прагнуць віртуальнай крыві? Сітуацыя, падобная да забароны наркотыкаў: колькі ні забараняй, а каму патрэбна – той знойдзе! Але гэта – справа кожнага з бацькоў, справа выхавання. А можа, калі нельга адвязацца ад камп'ютэрных гульняў, трэба выхоўваць... праз іх саміх?

«Камп'ютэрнае» выхаванне

Сапраўды, ці можна прывіць моладзі "разумнае, добрае, адвечнае" праз тое, чаму яны аддаюць перавагу?

Вядома ж, камп'ютэрная гульня — перш за ўсё, прадукт культурны, ці нават контркультурны, у залежнасці ад напаўнення. Цяжка недаацэньваць творчасць дызайнераў і графікаў, якія шмат робяць для таго, каб перанесці нас у далёкія часы гісторыі розных цывілізацый, на стадыён ці ў космас. А таму і свая эстэтыка ў іх прысутнічае.

Каб пераканаць тых, хто зусім супраць камп'ютэрных цацак, прывяду адзін прыклад з жыцця: хлопчык загадам лёсу навечна прыкаваны да ложку. А за вокнамі – цёпла, і яго аднагодкі бягуць ганяць у двары мяч. Што застаецца? Толькі адзін выхад: перанесціся на футбольны стадыён праз камп'ютэрныя сімулятары. І гэта яму вельмі дапаможа ў маральным плане, адцягне на які час гора і адзіноту!

Цяпер што тычыцца выпадаў у бок камп'ютэрных цацак з нагоды "культывацыі насілля". Так, некаторыя з іх сапраўды забаронены ў краінах Захаду. Некаторыя дазволены з заменай чырвонай крыві на зялёную ці ўвогуле без крыві. Але падобная падмена паняццяў, думаецца, толькі пагаршае сітуацыю: можа, даверлівы хлопчык будзе спасцігаць цяжкасці жыцця менавіта праз камп'ютэр, падумае: калі стукнуць чалавека рыдлёўкай па галаве, крыві не з'явіцца, а толькі зменшыцца лічба працэнтаў здароўя. У выніку ён не будзе ведаць, што адным ударам можна назаўжды пазбавіць чалавека жыцця...

Але гульні могуць стаць у разумных руках эфектыўным інструментам патрыятычнага выхавання. У апошнія гады на рынку з'явілася шмат адметных цацак, прысвечаных тэме Другой сусветнай вайны. Паколькі распрацоўваліся яны пераважна не ў краінах былога СССР, галоўнымі героямі сталі саюзнікі. Пагуляўшы ў такія выдатныя ў тэхнічным плане віртуальныя палотнішчы (напрыклад, "Медаль за адвагу"), губляешся і думаеш: "Няўжо бойкі з фашыстамі пачаліся ў... Нарманды?" Ні адзін action на сённяшні дзень не расказвае пра цяжкі 1941-ы, а нашым салдатам-пераможцам на захадзе вылучылі толькі некалькі эпізодаў у бестселеры Call Of Duty (Покліч абавязку). Для заходніх распрацоўшчыкаў найбольш папулярныя бітвы пад Сталінградам, Курскам, Харкавам і Берлінам. Падаецца, што за акіянам слаба вывучалі гісторыю, а некаторыя сцэны проста злізаны з заходніх кінастужак, як, напрыклад, высадка дэсанта ў Сталінградзе ў гульне Call Of Duty ўзята з фільма "Вораг ля варотаў". Распрацоўшчыкі бездакорна прымушаюць савецкіх герояў-пераможцаў размаўляць... па-англійску! Дый што там казаць, калі паўсюдна ў падобных гульнях пануе амерыканскі спецназ... Робіцца сапраўды крыўдна. Трэба дадаць, што ўшанаванне і ўсхваленне "нянашай" зброі ў часы Вялікай Айчыннай каралася самымі жорсткімі мерамі...

Падобныя гульні, лічу, не трэба забараняць, яны маюць права на існаванне. Баявыя дзеянні з боку саюзнікаў таксама прадстаўляюць пэўны гістарычны інтарэс. Аднак усім, хто незнаёмы з сапраўднай гісторыяй вайны, трэба тлумачыць, што яе выйграў на франтах баявых і працоўных менавіта савецкі народ, а не радавы Райян, які "ўставіў" свае пяць цэнтаў толькі пад канец агоніі рэйху.

Шкада, што на Беларусі не назіраецца моцных распрацоўшчыкаў, яны маглі б зрабіць дастойную гульню, якая б стала рэальным інструментам патрыятычнага выхавання маленькіх беларусаў, расказала пра баявыя будні партызан ці правяла іграка віртуальнымі франтавымі пуцявінамі той ці іншай праслаўленай часці.

У маі гэтага года быў зроблены значны крок Міністэрства абароны краіны ў бок камп'ютэрных гульняў: падчас выставы "СМІ ў Беларусі" праведзены спаборніцтвы па сімулятары "Іл-2. Штурмавік". Дарэчы, на высокім узроўні прагучала заява аб стварэнні цэнтра падрыхтоўкі маладых віртуальных ваенных на базе камп'ютэрных гульняў, арыентаванага перш за ўсё на юнакоў прызыўнога ўзросту. Выхаваць будучага салдата з дапамогай гульняў можна, але і поўнасцю падрыхтаваць – наўрад ці... Хаця, напрыклад, у ЗША міністэрства абароны рознабакова падтрымлівае стварэнне камп'ютэрных гульняў з удзелам "марскіх коцікаў", атрадаў Дэльта, танкаў Абрамс і многіх іншых. Яны праслаўляюць такім чынам сваю зброю. А мы чым горшыя?

Зараз існуе некалькі цацак расійскай вытворчасці, дзе тым ці іншым бокам закранута беларуская тэматыка. Напрыклад, у дадатку да стратэгіі "Бліцкрыг" ёсць заданне па аперацыі "Баграціён". А ў сімулятары "Іл-2. Штурмавік" можна біць фашыстаў менавіта ў беларускіх нябёсах! Таму пакуль прыйдзецца арыентавацца на іх...

Дарэчы, выхоўваць можна і на беларускіх спартыўных дасягненнях праз спартыўныя сімулятары. Але і тут, як у выпадку з Другой сусветнай, заходнія распрацоўшчыкі скрозь пальцы глядзяць на перамогі беларусаў, а сваіх майстроў пакуль не бачна...

Да камп'ютэрных гульняў сёння можна ставіцца па-рознаму. Відавочна адно: іх нельга недаацэньваць, нельга забараняць, бо гэта можа выклікаць зусім адваротную рэакцыю з боку спажыўцоў. Не трэба рабіць з камп'ютэрных гульняў ворага! Давайце зробім з іх саюзнікаў!

Сяргей ДУБОВІК

Фота забяспечана аўтарам

Малюнак Р. Куліковай

Валянцін ЛУКША

Колькі кіпцюроў у ката?

Я люблю ката пагладзіць,
Песню-муркалку пачуць.
Толькі як заўсёды ладзіць
З ім — даведацца хачу.

Шыйку кратаю і лапкі —
Кот зажмурыўся, бы ў сне,
І наважыўся падрапаць
Ад удзячнасці мяне.

Шчыра Барсіка частую
Смакатою зноў і зноў.
Сябра яўна не шкадуе
Мне адметных кіпцюроў.

Тата папярэдзіць хоча,
Каб не насмяшыў народ:
— Ды не лезь ты смоллю ў вочы,
Хай адпачывае кот.

— Э-эх, —
Сябры мне спачуваюць. —
Зноў падрапаў?..

Што сказаць:
— Кот на кожнай лапцы мае
Кіпцюроў
Па сорак пяць.

Лёля БАГДАНОВІЧ

Загадкі

* * *

Безумоўна, ён сіньёр.
Хоць зусім не памідор.
У гародзе важны туз.
І завуць яго...

(Гарбуз.)

* * *

Прыгажуня,
хоць куды.
Ружовыя шчочкі.
Любіць сонца,
шмат вады,
Як і агурочкі.
У салаце веснавой
Першая асоба.
Паспытайце яе й вы —
Што за асалода!
Ну, хутчэй давайце
міску,
Пакладу і вам...

(Рэдыскі.)

* * *

Ён зялёны і духмяны.
Прыйдзе восень —
саламяны.
У баразне і на градзе
Вырастае, дзе ўпадзе.
Засуха а ці патоп.
Ну, вядома, гэта...

(Кроп.)

* * *

Яна зрадні гароху.
У суп кладуць патроху.
Такая яе доля...
Завуць яе...

(Фасоля.)

* * *

На градзе стаіць,
як свечка,
Поўны семачак...

(Сланечнік.)

Валянціна АНКУДЗІНАВА

Гарэзы

Дзве сяброўкі ёсць у Рэкса —
Мурка, курачка-гарэза.
Яны ў хованкі гулялі,
Ўсю цыбулю патапталі.

Бедная мушка

Заспявала звонка мушка:
— Вы мае сяброўкі, птушкі!
А варона тое ўчула,
— Кар-р-р! —
і мушку праглынула...

Малюнак М. Лайковай

«Сястрычкі»

Падару я кошцы тапкі,
Ў сцюжу каб не мерзлі лапкі,
Ёй надзену рукавічкі,
Будзем з ёй як дзве сястрычкі.

Паляцім!

— Жу-жу-жу! — трымцела пчолка, —
— Паляцім са мной, Міколка!
Сябар мой — камар Макар
Падарыў ружовы шар!

Як мне спаць?

Ходзіць Вася невяселы.
— Што з табой?
— Мне заўтра ў школу.
Як захочацца мне спаць?
— Трэба коўдру ў школу браць!

Мішка

Плача мішка касалапы,
Выцірае слёзкі лапай:
— Адпусціце, людзі, з клеткі,
Засталіся ў лесе дзеткі...

Малюнак М. Лайковай

Я хварэю

Зноў ляжу я і хварэю,
Цёплым чаем горла грэю.
А чаго я расхварэўся?
Ды марожаным аб'еўся!

Васіль РАГАЎЦОЎ

Конік

— Быццам коннік,
скача конік,
Крылцамі стракоча.
Толькі ж дзе
падзеўся коннік?
Ну, скажы-ка,
Косця!

— Ды яго і быць не можа.
Гэты ж конік...
насякомае.
А жыве на лузе,
пожні —
Вось што мне вядома.

Юшка

— Мамка, нешта ў хаце душна.
— Адчыню я зараз юшку.
— Юшку?
— Ведай, мой сыночак:
Гэта з чугуну кружочак.
Зачыняюць юшкай комін,
Каб цяплей было у доме.
А яшчэ ёсць юшка — страва.
Рыба з рознаю прыправай:
Кропам, перчыкам, цыбулькай...
Заўтра едзем да бабулькі —
Пачастуе смачнай юшкай.
Не адцягнеш і за вушкі...
— Еду! Еду заўтра ў госці! —
З радасці падскокваў Косцік.

Для кемлівых

Перастаўце літары так, каб атрымаліся назвы птушак:

СУЛЕБ
АВОНАР
АВЕЙБЕР
ГУЛОБ
ЛЯДЗЕЦ
РАСАКО
АЦІНІС
АВАС

Малюнак Р. Куліковай

ЯК АСІНКУ АД ХВАРОБЫ РАТАВАЛІ

(Казка)

Жыў ды быў у лесе Клён, сябраваў з Асінкай ён. І яна з ім сябравала, яму песенькі спявала. Падзьме ветрык на галінкі — і пачне спяваць Асінка. Клён заўжды ёй падпяваў, дуб для іх на скрыпцы граў, дзве яліны ў бубен білі, тры сасны ў трубу трубілі. Ажно ў лесе ўсё гуло, так ім весела было.

Ды Асінка захварэла. Ні піла яна, ні ела, нават песень не спявала... адным словам — сумавала.

Замаркоціўся і Клён, дактароў гукае ён. Ды якія ж ў бары могуць стацца дактары?

Першым Заяц прыскакаў, з Клёнам гутарку пачаў. Кажа:

— Для яе карысці трэба ёй кары пагрызці. Пагрызу кару і, можа, гэта трошкі дапаможа.

А затым Мядзведзь прыйшоў.

— Вох, насілу вас знайшоў! Прапаную: у Асінкі абламаць дзве-тры галінкі. Абламаю іх і, можа, гэта хворай дапаможа.

Тут, глядзіць — Барсук імчыць і яшчэ здалёк крычыць:

— Ды яны не дактары! Гэта я ў сваёй нары медыцыну вывучаю і хваробы вызначаю! Прапаную: у Асінкі, не кару, і не галінкі, карані перакапаць — там хваробу пашукаць!

Уздыхнуў самотна Клён, дактарам адмовіў ён. Зноў гукае, зноў бядуе — хто ж Асінку пашкадуе?!

Раптам Дзяцел прыляцеў, да Асінкі падляцеў. Сеў Асінцы на галінку і давай лячыць Асінку. Змераў ёй тэмпературу, даў таблетку, даў мікстуру, туманамі абвязаў... адлятаючы, сказаў:

— Калі будзе хто хварэць, то ні Заяц, ні Мядзведзь, ні Барсук не дапамогуць, бо лячыць яны не могуць! У зялёным у бары толькі дзятлы — дактары! Так што, вы мяне гукайце... ну, а зараз, выбачайце! Я дадому палячу, іншых хворых палячу!

Тут і казкі заканчэнне, бо праз дзятлава лячэнне ўраз Асінка ачуняла, зноў яна вясёлай стала. Зноўку песенькі спявае, Клён, вядома ж, падпявае...

Зноў гулянка ў іх ідзе, ажно ў лесе ўсё гудзе!

Генадзь АЎЛАСЕНКА

Малюнак М. Лайковай

Праца-гарэнне

Перагортваючы старонкі дзён прамінулых і сучасных, усё ясней бачыш веліч постацей двух братоў, якія пакінулі прыкметны след у беларускай культуры і навуцы, — Максіма і Гаўрылы Гарэцкіх. Цікавыя, шмат у чым падобныя і іх лёсы.

Плёнам сумеснай навуковай дзейнасці Максіма Іванавіча — пісьменніка, фалькларыста, літаратуразнаўцы, публіцыста, грамадскага дзеяча (1893—1938) і Гаўрылы Іванавіча — геолага, географа, эканаміста, грамадскага дзеяча (1900—1988, сёлета адзначалася 105-годдзе з дня яго нараджэння) сталіся слоўнікі. Людзі, якія займаліся, здавалася б, зусім рознымі відамі дзейнасці, сышліся ў працы-стварэнні, працы-*гарэнні*. Нездарма ж яны — *Гарэцкія*. З "Маскоўска-беларускім слоўнікам" (выд. 2-е.; Вільня, 1921) хочацца бліжэй пазнаёміць шаноўных чытачоў.

Ствараўся гэты слоўнік у той час, калі маладая беларуская дзяржава адчувала вострую неабходнасць у падобных выданнях. Тады намаганнямі вучоных Інбелкульта адзін за адным выходзілі слоўнікі, сярод якіх былі і спецыяльныя — па розных галінах ведаў, і перакладныя, і ўсялякія іншыя. Браты Гарэцкія таксама спрычыніліся да гэтай працы. Яны былі амаль што першапраходцамі, таму ім было асабліва цяжка.

Варта адзначыць, што скласці добры слоўнік наогул вельмі няпроста. Кожнае слова, уведзенае ў яго, павінна быць навукова ўзважаным, абгрунтаваным. У тым выпадку, калі слоўнік перакладны, трэба з асаблівай увагай ставіцца да ўключэння ў яго слоў, запазычаных з суседніх моў (рускай і польскай), слоў-калек (дакладных памарфемных перакладаў з іншых моў), а таксама дыялектызмаў і наватвораў. У слоўніку неабходна вытрымліваць меру, тонка адчуваючы прыродную гармонію беларускай мовы. Тады гэтае навуковае выданне не будзе выклікаць пярэчанняў і крытычных заўваг. Звычайна слоўнікі складаюцца калектывам аўтараў, па-сапраўднаму захопленых сваёй працай і адпаведна падрыхтаваных, кваліфікаваных для яе выканання. І разлічана такая праца на месяцы і гады...

Слоўнікавая работа патрабуе цярпення і мэтанакіраванасці. Некаму яна можа падацца манатоннай і нават пазбаўленай сэнсу (калі падрыхтаваны слоўнік не будзе выдадзены). Але плён гэтай працы жыве стагоддзі. Вось чаму імёны такіх вядомых беларускіх лексікографаў, як І.І. Насовіч, І.К. Бялькевіч, М.В. Бірыла, Г.А. Цыхун, А.М. Булыка, В.П. Лемцюгова, А.К. Клышка, І.Р. Шкраба і многія-многія іншыя застаюцца ва ўдзячнай людской памяці.

Якімі ж крытэрыямі кіраваліся браты Гарэцкія пры ўключэнні слоў у свой слоўнік? У прадмове да 1-га выдання, напісанай у Смаленску ў 1918 годзе, Гарэцкія пішуць, што рабілі слоўнік, "*слухаючы свайго вуха і не зважаючы надта на тое, ці хто хваліць, ці хто ганіць будзе*". І прапануюць "*жменю цікавейшых слоў к патрэбе і на добрае ўжываньне маладым адраджоным братом*". А ў прадмове да 2-га выдання слоўніка (напісанай у Вільні ў 1920 годзе) браты Гарэцкія заўважаюць, што "*гэты невялікі зборнік* слоў спадзяецца на знаёмства чытаньніка з важнейшымі асаблівасьцямі беларускае мовы. Дзеля таго ён не зьмяшчаець слоў, што ў сваіх асновах зусім ці надта падобныя ў абедзьвюх мовах і што маюць розьніцу толькі ў склонах ці надта падобныя ў абедзьвюх мовах і што маюць розьніцу толькі ў склонах ці ў спражэньнях. Ня зьмешчаны ў ім таксама словы для абстракцыйных разуменьняў, узятыя ў маскоўскую літэратуру з агульнаэўропэйскага ўжываньня, бо найчасьцей яны ёсьць і ў беларускай мове, толькі вымаўляюцца на свой лад".

У 2-е выданне слоўніка ўключана каля 7 тысяч слоў. З іх большую частку складаюць беларускія адпаведнікі рускіх слоў. Такім чынам, больш за тры тысячы рускіх (ці "маскоўскіх") слоў растлумачаны прыблізна трыма з паловай тысяч іх беларускіх адпаведнікаў. Пры гэтым значная частка рускіх слоў тлумачыцца не адным, а двума-трыма беларускімі або нават цэлымі фразамі, выразамі, фразеалагічнымі словазлучэннямі. Таму слоўнік уяўляе вялікую навуковую каштоўнасць, паколькі ён утрымлівае шмат самабытных, арыгінальных, нават створаных самімі аўтарамі беларускіх слоў. Гэта адначасова слоўнік і сінонімаў, і фразеалагізмаў, і тэрмінаў. У той жа час ён застаецца перакладным, руска-беларускім. Унікальнае выданне, унікальная навуковая праца. Браты Гарэцкія не пашкадавалі ні сіл, ні часу для таго, каб зрабіць свой слоўнік цікавым, змястоўным, карысным для мовазнаўцы і перакладчыка, для настаўніка і вучня, а таксама для спецыялістаў розных галін ведаў.

Безумоўна, шмат што ў гэтым слоўніку не вытрымала выпрабавання часам. Некаторыя беларускія тлумачэнні рускіх слоў аказаліся непрыдатнымі для розных галін чалавечай дзейнасці, г.зн. недастаткова універсальнымі. Але разам з тым бясспрэчнай станоўчай якасцю слоўніка і для нашага часу з'яўляецца імкненне братоў Гарэцкіх удумліва ставіцца да адбору беларускіх слоў, утвараць новыя словы пры дапамозе самых розных сродкаў, узбагачаць мову за кошт дыялектызмаў і наватвораў. Прывядзём некалькі беларускіх перакладаў-тлумачэнняў з "Маскоўска-беларускага слоўніка" Максіма і Гаўрылы Гарэцкіх: "аукать — гукаць, клікаць, гойкаць", "баловень — пястун, патвора", "бороться — змагацца, дужацца, ходацца, борыцца, тузацца", "быстрота — быстрыня, шыбкасьць, шпаркасьць, хуткасьць", "взнуздать — закялзаць, абратаць, заміздаць", "внизу — унізе, насподзе, падысподам", "вероятно — бадай, спадзеўна, можа быць, пеўна, мабыць, мусіць быць", "истощиться — ашчэгнуць, выбіцца з духу, аслабнуць, спаражніцца"...

Заўважаецца, што аўтары слоўніка пазбягаюць ужывання русізмаў і паланізмаў, што браты Гарэцкія звяртаюцца да ўсяго лексічнага багацця беларускіх дыялектаў і імкнуцца яго выкарыстаць. Мова слоўніка ўражвае сваёй паэтычнасцю, мастацкасцю. Нездарма многія словы з яго потым ужываліся шматлікімі беларускімі пісьменнікамі, асабліва ў 1920—1930-я гады. Яны сустракаюцца ў сучасным беларускім друку, а слова "страўня" — "сталовая, сталовы пакой", якое ўжываецца ў аповесці "Дзве душы" М.І. Гарэцкага і зафіксавана ў "Маскоўска-беларускім слоўніку", можна ўбачыць у Мінску на шыльдах.

У слоўніку прадстаўлены словы розных часцін мовы — назоўнікі, прыметнікі, дзеясловы, прыслоўі, службовыя словы. Сярод беларускіх адпаведнікаў — словы, якія бытуюць і ў наш час, устарэлыя (што выйшлі з ужытку), мясцовыя, аўтарскія. Прапанаваныя аўтарамі словаўтваральныя мадэлі, магчыма, не заўсёды ўдалыя. Аднак "Маскоўска-беларускі слоўнік" братоў Гарэцкіх надзвычай карысны для нас тым, што прымушае творча ставіцца да сваёй мовы, выклікае жаданне прыдумваць новыя словы — яркія і зіхоткія, як сапраўдныя пярліны. І ўсё глыбей і глыбей пагружацца ў моўны акіян, каб нарэшце знайсці тыя адзіна патрэбныя словы, якімі можна было б апісаць любоў і нянавісць, крыўду і зайздрасць, шчасце і замілаванне — усю непаўторную гаму чалавечых пачуццяў.

Святлана ЯВАР

Хвалі. Бязмежная плынь...

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 9)

ся? Даследуеце людзей, грэшныя людскія душы, якія чорныя, падобныя змроку начы. Так?

Вольга зірнула на Андрэя.

— Тсс... Маўчыце. Я ведаю, што вы хочаце мне сказаць. Я стамілася слухаць спачувальныя словы. Не трэба. Зараз вы мяне суцешыце, потым пачняце распавядаць пра Бога, пра людскія лёсы... Я ўжо чула ўсё. Раней. Даўно... І сёння.

Дзяўчына глыбока ўздыхнула.

Андрэй не ведаў што прамовіць. Вольга, відаць, знаходзілася ў глыбокай дэпрэсіі, нягледзячы на знешні спакой. Яму хацелася суцешыць дзяўчыну, але ейны позірк сведчыў, — любыя словы, якія прамовіць Андрэй сённяшнім вечарам, разаб'юцца аб яе схаладалае сэрца. Не пакінуць следа.

І ён маўчаў.

— Усяму свой час, Андрэй. Час жыць і час паміраць. Вы ж ведаеце гэтыя радкі... Значыць, такім склаўся лёс. Камусьці на нябёсах спатрэбілася яе смерць. Скажыце, што гэта так. Скажыце, што яе жыццё і смерць не дарэмныя, што яна таксама патрэбна Усявышняму. Праўда?.. Маўчыце, ведаю ваш адказ.

На катэдру падняўся пастар і прыняўся гартаць Біблію. Набліжалася набажэнства.

— Лідуся была вельмі добрай, чалавекам шчырага сэрца, — прамовіла Вольга. — Шкада, атрымалася не так, як хацелася. Андрэй, чаму заўсёды ў жыцці мы атрымліваем тое, ад чаго бяжым, адмаўляемся? А тое, чаго хоча сэрца, уцякае ад нас, абыходзіць бокам. Лёс выпрабоўвае нас на моц, калі забірае блізкіх? А што потым з намі будзе? Куды мы ўсе спяшаемся, бяжым стрымгалоў, куды і навошта імкнёмся? Каму трэба нашыя мільёны, калі мы раптоўна пазбаўляемся жыцця і магчымасці іх траціць?

Ён не ведаў адказу.

— Смерць Лідусі вельмі адбілася на маім унутраным свеце. Ведаеце, Андрэй, я ізноў маляваць пачала не за грошы, а проста так, для душы, як даўным-даўно, шмат гадоў таму. Вось літары напісала для вашай царквы, бацька прасіў. Бог ёсць Любоў — гэта праўда, Андрэй?

Ён згодна кіўнуў галавой.

— Я веру, Андрэй. Бог насамрэч Любоў, раз мы ўсё яшчэ жывыя.

Андрэй згадзіўся. Прыйшла на памяць яшчэ адна выпрымка з Пісання, дзе сказана — Бог ёсць агонь паглынаючы. Веруючыя чамусьці рэдка ўзгадваюць менавіта гэты выраз...

— Я буду маліцца, каб у другім, трэцім, дзесятым жыцці яна была шчаслівай. Я веру, мы з ёй сустрэнемся калі-небудзь. Вы верыце ў перасяленне душ, у рэінкарнацыю?

Андрэй засумаваў. Цяжэй за ўсё на свеце растлумачыць самае простае, неабходнае, тое, што спатрэбіцца там, у вечнасці гэтак жа, як і тут у свеце. Вольгу было шкада. Людзям часам бліжэй да душы складаныя галаваломныя філасофіі, у сутнасці сваёй мёртвыя. Людзі прагнуць больш ведаць пра рэінкарнацыю, свяцтлую карму, чакры і нірвану, чым прыняць з дзіцячай прастатой бацькоўскую любоў Бога. Першачаргова для чалавека, Бог ёсць Любоў. Інакш не было б Хрыста ніколі на зямлі.

Побач з імі прысеў невядомы Андрэю чалавек. Адразу падказала фатаграфічная памяць, незнаёмец раней у малітоўным доме не з'яўляўся. Андрэя зачапіла незвычайная цікавасць у вачах гэтага чалавека, які неадрыўна пазіраў у намаляваны Вольгай надпіс. Склалася ўражанне, што словы на сцяне над катэдрай вельмі кранулі незнаёмца.

— Ведаеце, Андрэй, я хачу вам падзякаваць, — прамовіла Вольга. — Адчуваючы ваш погляд на той вечарыне, я зразумела, што не адна на свеце. Дзякуй вам. Вы мяне вельмі падтрымалі. Згадзіцеся, парою так мала трэба для чалавека.

Вольга паднялася.

— Дзякуй і бывайце. Была рада пазнаёміцца. Хто ведае, мо яшчэ сустрэнемся?

Яна развярнулася і пакрочыла да дзвярэй.

Андрэй коратка азірнуўся, хацеў махнуць рукой.

Пачалася пропаведзь.

Андрэй доўга сядзеў, моцна задумаўшыся аб нечым сваім і амаль нічога не чуў.

● «Бог ёсць Любоў», — прачытаў Міклуш і адчуў нечаканую палёгку ў сэрцы.

Як, чаму? — Міклуш не ведаў. Не разумеў. Але адчуваў незвычайны спакой.

Ён паглядзеў вакол. Малітоўны дом паступова напаўняўся людзьмі. Наперадзе сядзеў малады чалавек у акулярах, джуце, з сумкай цераз плячо. Побач — бялявая дзяўчына. Яны аб чымсьці размаўлялі. Міклуш прысеў побач.

Ён неадрыўна глядзеў на надпіс і не мог зразумець, чаму вочы робяцца вільготнымі.

Чаму Міклуш раней не ведаў гэтай біблейскай аксіёмы?

Мноства пытанняў мроілася ў галаве.

Цеплыня ахінала цела, спакой разліваўся па жылах.

● Набажэнства заканчвалася.

Андрэй стаяў каля акна за апошнім радам лавак.

Думкі ўзнікалі самі сабой, хутка плылі і знікалі. Перад вачамі стаяла Вольга.

Пасля кароткай размовы з Андрэем яна хутка знікла.

Яна, можа, сюды больш ні разу не вернецца, але на доўгія гады застанецца выкананы ейнай рукой надпіс — Бог ёсць Любоў.

Кожны наведвальнік малітоўнага дома першапачаткова будзе звяртаць увагу на гэтыя словы.

Дзіўна, ніхто нават не будзе ведаць, што літары намалявала звычайная дзяўчына, якая нягледзячы на ўзрост паспела ўжо паспытаць жыццё. Ніхто не спытаецца яе імя. Ды і навошта, калі разабрацца. Важны ўчынкі, а не імя.

Ён узяў фотакамеру. Наблізіў акуляр да вока.

Наперадзе сядзеў незнаёмец, які сёння відавочна ўпершыню завітаў у малітоўны дом. Яго натхнёны твар вельмі ўразіў Андрэя.

Ці не дзеля незнаёмца спатрэбіўся гэты надпіс?

Насамрэч, Бог ёсць Любоў.

Нямая пропаведзь...

Пстрык!

● А ў гэты самы час, далёка адсюль, нікому пакуль невядомы пісьменнік Янусь заканчваў свой твор пра вечнасць, бязмежную плынь хваляў сусветнага акіяна. Хлопец зусім не быў знаёмы з Вольгай, Андрэем, тым больш не ведаў ён і Лідусю, вакол смерці якой і адбылася ўся гэта гісторыя.

Не Янусь «запусціў» ланцужок аповеда. Ён толькі выканаў сваю ролю, напісаную звыш. І калі мы пашукаем прычыну, то мусім прайсці бясконцы шлях, каб апынуцца на пачатку вякоў, у той самы момант, калі Усявышні Творца прамовіў «Няхай будзе святло!», і бязмежная плынь хваляў панесла сусветную гісторыю складаным шляхам у акіяне вечнасці, нараджаючы безліч наступстваў.

І хвалі б'юцца недзе аб невядомы бераг невядомай зямлі, гудзяць нібы званы, і чуецца скрозь іх Янусёў шэпт: «Божа, падштурхні набліжэнне будучыні, даруй за рэчаіснасць, злітуйся над намі з-за нашых учынкаў»...

Medzinárodná porota BIB 2005 udeľuje
Čestné uznanie vydavateľstvu

The BIB 2005 International Jury grants
Honorable Mention to the Publisher

to Marya Jagoudzik, Minsk, 2005, Belarus

Predseda Medzinárodnej poroty
Chairman of the BIB International Jury

У верасні адбыўся юбілейны, 20 БІБ — Біенале Ілюстрацый Браціслава-2005 (of Biennial of Illustrations Bratislava 2005 — BIB), пры падвядзенні вынікаў якога стала вядома, што нашчадкі славутага першадрукара Ф.Скарыны аказаліся лепшымі ў свеце выдаўцамі дзіцячых кніг... Аднак пра ўсё па парадку.

Пачынаючы з МІФА

Браціслаўскае Біенале аб'ядноўвае дзіцячых мастакоў-ілюстратараў з усяго свету, але ацэньваюцца тут і літаратурна-мастацкія выданні для дзяцей. У 1985 годзе мастак Мікола Селяшчук атрымаў медаль БІБа за ілюстрацыі да "Казак беларускіх пісьменнікаў", у 2001-ым Паўла Татарнікава ўзнагародзілі прэміяй "Залаты яблык" за ілюстрацыі да кнігі Уладзіміра Ягоўдзіка "Царэўна ў падземным царстве".

Гэтым разам у Біенале брала ўдзел 48 краін свету, 410 ілюстратараў, сярод якіх свае работы прадставілі 8 беларускіх мастакоў і адпаведна на конкурс выносілася 8 кніг. Аднак ганаровы дыплом БІБа атрымала выдавецтва, а дакладней выдавец Марыя Ягоўдзік за "Выбранае" Уладзіміра Ягоўдзіка ў 2-х тамах (мастак Юрась Алісевіч, рэдактар Алесь Траяноўскі). Такім чынам: беларусы перад усім светам былі прызнаныя аднымі з лепшых у справе кнігадрукавання для дзяцей.

Што ўяўляе сабой "Выбранае"? Акрамя прыгожага мастацкага аздаблення і выдатнай паліграфіі кніга мае асноўнае — багаты і цікавы змест. Першы том складаюць творы, прысвечаныя прыродзе, — кароткія апавяданні і "Азбукоўнік", другі — аповесці і апавяданні, пра беларускую гісторыю і культуру, а таксама казкі Уладзіміра Ягоўдзіка. У прадмове да выдання Янка Брыль адзначыў: "З асабліва змястоўнай яснасцю і цёплай глыбінёй слова Ягоўдзіка праяўляецца ў тым, што гэты зайздросна энергічны, нястомны ў творчых пошуках пісьменнік і журналіст робіць для найбліжэйшых сяброў — дзяцей. Тут і ўласныя творы, падказаныя шчырым сэрцам і неспакойнай думкай, тут і руплівая, таксама ж творчая праца рэдактарам спачатку газеты "Дзеці і мы", потым заслужана вядомай "Бярозкі" і створанага няўрымслівым шукальнікам сімпатычна яркага экалагічнага часопіса "Лесавік" і бібліятэчкі пры ім, тут, нарэшце, і двухтомнік выбраных твораў, у якім размова вядзецца аўтарам, бадай, найбольш паспяхова з нашай малечай, падлеткамі, раннім юнацтвам".

З нагоды гэтай прэстыжнай узнагароды і адбылася наступная гутарка з Уладзімірам Ягоўдзікам.

— Уладзімір Іванавіч, такая перамога ў сусветным спаборніцтве — гонар і слава Беларусі, аднак шлях да яе наўрад ці быў лёгкім і кароткім. Раскажыце, калі ласка, з чаго і калі ўсё пачалося.

— Усё пачалося ў 90-х гадах, калі быў сапраўдны бум прадпрымальніцтва і ўзнікла шмат прыватных выдавецтваў. Да мяне звярнуліся людзі, далёкія ад літаратуры, з просьбай выдаць некалькі маіх кніг. Такім чынам, у 1992 — 93-м выйшлі легенды і паданні Беларусі "Заклятыя скарбы", зборнік апавяданняў "Ці вернецца князь Кук", кніга на рускай мове "В царстве водяного". Трэба сказаць, што "Заклятыя скарбы" мелі не надта прывабнае мастацкае афармленне і пры тым вялікі тыраж — 200 000 асобнікаў.

І вось убачыўшы, як людзі, абсалютна далёкія ад літаратуры, тым больш дзіцячай, бяруцца за гэтую справу, я зразумеў, што трэба пачынаць нешта рабіць. Так у 1995 годзе ўзнік "Лесавік" — часопіс сяброў прыроды, экалагічнае выданне для сям'і і школы. Некалькі гадоў ён выдаваўся як плакат, стаў вядомы ў Беларусі, а з 1998-га выходзіць менавіта як часопіс. Я вельмі ўдзячны за падтрымку ўсім, хто разумее важнасць і неабходнасць гэтага адзінага ў Беларусі экалагічнага выдання для дзяцей, асабліва былому міністру экалогіі Міхаілу Іванавічу Русаму, супрацоўнікам дзіцячых бібліятэк, якія падпісваюцца на "Лесавік", нягледзячы на тое, што яго няма ў спісах абавязковых для падпіскі выданняў, удзячны Міністэрству экалогіі і прыродных рэсурсаў, абласным камітэтам экалогіі і раённым інспекцыям...

Калі "Лесавік" "пайшоў", паглядзеўшы на той вал літаратуры, дзе няма месца дзіцячым беларускамоўным кнігам, асабліва пасля знікнення выдавецтва "Юнацтва", мы пачалі выдавецкую дзейнасць менавіта ў гэтым накірунку. За тры гады было выдадзена 7 маіх кніг, прысвечаных роднай прыродзе, першыя з якіх "Птушыная дарога" і "Рэха турынага рога".

— Што абумовіла належны ўзровень вашых выданняў?

— Перш за ўсё праца мастакоў, бо для таго, каб дзіцячая кніга мела "гучанне", была на высокім ўзроўні, яна павінна прыгожа ілюстравацца. А высакакласныя ілюстратары ў нас ёсць, бо існуе ў Акадэміі мастацтваў надзвычай моцная кафедра графікі, якую ўзначальвае прафесар, заслужаны дзеяч мастацтваў Уладзімір Савіч. Я працаваў з выдатнымі мастакамі — Аленай Лось, Уладзімірам Вішнеўскім, Паўлам Татарнікавым, нарэшце з Юрасём Алісевічам, які ілюстраваў "Выбранае".

Каб выпусціць папулярную кнігу для дзяцей, неабходна таксама адчуваць запатрабаванасць. Напрыклад, выдадзеная перад "Выбраным" кніга "Нацыянальныя паркі і запаведнікі Беларусі", якая, дарэчы, змяшчае 140 здымкаў, была рэалізавана за тры месяцы пры шасцітысячным тыражы. А яшчэ трэба не баяцца часу, які сёння вучыць нас самастойнасці і смеламу прыняццю рашэння.

— Зразумела, поспех уганараванай кнігі быў забяспечаны тым жа.

— Канечне, аднак каб выдаць такую кнігу неабходны яшчэ дзве ўмовы: вялікае жаданне і фінансавыя сродкі. Тут усё ўдала спалучылася, але задума рэалізавалася не адразу, бо дзеля тых самых фінансавых сродкаў трэба было працаваць пяць гадоў.

— Напэўна, зараз вам даводзіцца займацца распаўсюджаннем выдання. Што для гэтага робіцца?

— Была праведзена невялікая рэклама, кніга аб'яўлена па падпісцы, супрацоўнікі цэнтральнай дзіцячай бібліятэчнай сістэмы заклапочаны тым, каб зрабіць прэзентацыю. Акрамя таго, дзеля распаўсюджання трэба працаваць з раённымі аддзеламі адукацыі, школамі, экалагічнымі арганізацыямі, праўда, не заўсёды сам пісьменнік павінен гэтым займацца...

— Прыгожай "знешнасці" вашай кнігі адпавядае не менш прывабная сутнасць. Па якім жа прынцыпе ішоў адбор твораў для "Выбранага"?

— Двухтомнік, які ўключае творы з папярэдніх выданняў, спачатку бачыўся ў іншым фармаце і падборы матэрыялаў, але паступова адсейвалася ўсё лішняе. Пры складанні першага тома стаяла задача з'яднаць у адно цэлае навуку (батаніку і біялогію) з міфалогіяй (легендамі і паданнямі). Другая кніга па сваёй задуме павінна яшчэ раз вярнуць дзяцей да нашай гісторыі, паказаць яе займальна і яскрава. Некаму з мудрых належыць выслоўе: "Літаратура пачынаецца з міфа і канчаецца ім". Гэта, можна сказаць, і быў галоўны прынцып выбару твораў.

Аднак заўважу, што выбранае не значыць нешта кананічнае, хрэстаматыйнае. Проста мне захацелася стварыць для дзяцей цікавую і пазнавальную кнігу з кароткімі, ёмкімі тэкстамі, прычым выдаць яе на высокім мастацкім і паліграфічным узроўні.

Наталля ЯКАВЕНКА

ЗАХАРАВА, 19

Пішыце на адрас: 220005, Мінск, вул. Захарава, 19, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва";
e-mail: minsk@lim.by
Адрас у Інтэрнеце — www.lim.by

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Літаратура і Мастацтва»

— прымае да разгляду выдавецкія праекты самай шырокай тэматыкі;
— выканае ўвесь спектр рэдакцыйна-выдавецкіх паслуг;
— арганізуе рэкламу і прэзентацыю выданняў.

Вул. Захарава, 19,
тэл.: 284-79-65

Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць № 02330/0056810 ад 2 сакавіка 2004 года, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Кнігі можна набыць у Рэдакцыйна-выдавецкай установе "Літаратура і Мастацтва". Тэлефоны аддзела маркетынгу і рэкламнай дзейнасці: 284-79-65; (факс) 284-82-04.

Юлія ШПІЛЕЎСКАЯ — актрыса Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Нарадзілася ў Мінску ў 1977 годзе. Скончыла Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў. За час працы ў тэатры сыграла пяць роляў у спектаклях "Паўлінка" (Паўлінка), "Сон у летнюю ноч" (Іпаліта), "Каханне ў стылі барока" (Оляна), "Івона, прынцэса Бургундская" (Іза), "Чорная панна Нясвіжа" (Барбара).

БАРБАРА РАДЗІВІЛ пачынала... Паўлінкай

Юля, я ведаю, што ты вучылася ў педагагічным універсітэце, але не скончыла яго і паступіла ў Акадэмію мастацтваў. Чаму змяніла спецыяльнасць?

— Я вучылася ў тэатральнай школе, але не ў тэатральным класе. І з прычыны таго, што ў нас пастаянна ішла "вайна" паміж тэатраламі і нетэатраламі, я не хацела быць актрысай, хаця настаўнік сцэнічнага мастацтва некалькі разоў запрашаў мяне на свой курс. Але я скончыла звычайную школу, абрала зямную прафесію. Прайшоў год, і тэатр нагадаў пра сябе. Выпадкова я сустрэлася з Фамой Варанецкім. (Менавіта ён выкладаў у школе сцэнічнае мастацтва). Фама Сільвестравіч сказаў, што Наталля Гайда набірае першы эксперыментальны курс — для будучага размеркавання ў тэатр музкамедыі. І я пайшла. Бацькі дазволілі, але пры ўмове, што буду здаваць сесію ў педуніверсітэце.

— Бацькі не вельмі злаваліся?

— Мае бацькі разумныя людзі. Калі не могуць дапамагчы, дык не перашкаджаюць. Яны далі мне самой выбраць свой лёс. Так я паступіла ў Акадэмію мастацтваў.

— Тэатр — гэта лёс?

— Так, лёс. Але — няхай даруюць мне мае выкладчыкі — я не на сто працэнтаў аддаюся тэатру. Сцэна, вядома, на першым месцы, але ў мяне ёсць яшчэ радыё і тэлебачанне. І я супраць фанатызму ва ўсялякай яго праяве. Лічу, што ў жыцці трэба ўсё сумяшчаць.

— Якіх вышыняў хацела б дасягнуць?

– З узростам разумееш, што слава — не самае галоўнае ў жыцці. Калі няма гармоніі ў душы, то ўсе дасягненні і вышыні — нішто. Гэта добра: мець "Оскар", "Крышталёвую Паўлінку", іншыя ўзнагароды, але навошта яны, калі чалавеку няма з кім падзяліць свой поспех? Безумоўна, прыемна мець у жыцці ўсё і каб атрымлівалася ўсё. Калі за ролю, ці нават за эпізод, могуць сказаць добрае слова.

— Юля, ты мне вельмі спадабалася ў ролі Барбары Радзівіл. Скажы, твой характар і характар гераіні — падобныя ці палярныя?

— Спачатку гэтая роля з'яўлялася прэрагатывай Святланы Зелянкоўскай. Пазней прапанавалі мне. Ішла да гэтага складана. Было страшна ўжывацца ў вобраз, бо спектакль містычны, а я з дзяцінства баялася могілак і ўсяго, што з імі звязана. Наведваючы рэпетыцыі і назіраючы за Святланай, я нават спаўзала пад крэсла ад страху. Але пераадолела яго. Цяпер вельмі люблю гэтую ролю. Характар Барбары Радзівіл блізкі майму, толькі атручвацца з-за кахання я б не рашылася.. Хаця, не ведаю... Як у кожнага чалавека, у мяне таксама ёсць і цёмны, і светлы бок. Змагаюся з цёмным. Як? Не ведаю. Каб ведала, дык даўно перамагла б яго. Толькі ўпэўненая ў адным: чалавек павінен быць моцным і ў стасунках з людзьмі размаўляць толькі са светлым бокам чалавечай душы, не рэагаваць на цёмныя сілы. Я за шчырасць, адкрытасць, праўду.

— Пытанне, якое журналісты часта задаюць акцёрам: якая любімая роля?

— Ёсць ролі, у якіх пачуваю сябе вольна, а ёсць наадварот. Скажу пакуль, што ў спектаклі "Чорная панна Нясвіжа" адчуваю сябе вольна. А вось любімая роля з Купалаўскім тэатрам не звязаная. Гэта Мэры Попінс, якую іграла ў дзіцячым мюзікле.

— У тэатр ты прыйшла Паўлінкай. Яе цяжка было іграць?

— Так, цяжка. Я іграла ў спектаклі і адначасова здавала дзяржаўныя іспыты ў акадэміі. Была зусім зялёная, непадрыхтаваная, не мела той свабоды, якой Янка Купала надзяліў Паўлінку. З усіх бакоў мне гаварылі: больш гарэзлівасці, весялосці... Гэта складаная роля.

— Тваё стаўленне да кіно, серыялаў. Хочацца здымацца?

— Які ж акцёр не марыць здымацца! У мяне былі эпізадычныя ролі ў даўно забытых серыялах. Пасля іх зразумела, што кіно – іншы свет, да якога трэба прызвычаіцца. І я для гэтага адкрытая. Мне цікава ўдзельнічаць у тых праектах, якія дадуць прафесійны досвед, вопыт. Але пакутаваць з таго, што не запрашаюць на здымачную пляцоўку, я не буду. Гэта не ў маім характары. І яшчэ, мне не падабаецца, што рэжысёры ставяцца да беларускіх акцёраў не так, як да расійскіх. Чаму мы павінны працаваць толькі на другарадных ролях і ў эпізодах?

— Прыхільнасці ў выяўленчым мастацтве, музыцы, літаратуры...

— На жаль, я мала ведаю беларускае выяўленчае мастацтва. У літаратуры люблю і ганаруся класікай. Праўда, не магу сказаць, што творы Івана Мележа, Кузьмы Чорнага ці каго-небудзь іншага з пісьменнікаў — мае настольныя кнігі. Такой у мяне няма зусім. У музыцы аддаю перавагу напрамкам з нацыянальным каларытам. Прыклад — гурт "Стары Ольса".

— Ад прыхільнасцей мастацкіх да кулінарных. Што падабаецца?

— Я напалову вегетарыянка. Больш за ўсё люблю сыр. Магу есці розны і ў любых колькасцях. Культ з ежы не ствараю. Яна простая, але ад шакаладу і марожанага не адмоўлюся ніколі. Фірменная страва – суп з цыбулі па-французску.

— Юля, амаль кожны дзень бачу тваю чароўную ўсмешку на плакаце ў раёне плошчы Перамогі. Ты здымаешся ў рэкламе?

– Здымаюся і не саромеюся гэтага. Рэклама таксама дае вопыт. Галоўнае, не ставіцца да яе як да халтуры. Трэба за ўсё брацца сур'ёзна, з адказнасцю. Ад рэкламы нам не пазбавіцца. Яна зрабілася часткай жыцця. Дык давайце зробім яе якасна.

— Пытанне, якое задаю сваім суразмоўцам часта: каханне дапамагае ці перашкаджае працы?

— Калі мне трэба працаваць над роллю, а на вуліцы чакае Рамэа, то, канечне, перашкаджае. Але па большыні бывае так, што на душы ўсё спакойна, камфортна. Ты ведаеш, што цябе нехта кахае, і таксама аддаеш свае пачуцці. Працаваць лёгка, прыемна. Іншая справа — іграць каханне...

— Дарэчы: чутак пра твае раманы з партнёрамі не было?

– Так атрымалася, што каханне мне даводзіцца іграць з адным артыстам, з Мікалаем Прылуцкім. Былі чуткі, але яны беспадстаўныя, бо ўсе ведаюць, што ён — не свабодны. У яго цудоўныя адносіны з жонкай. І я яе ведаю. Не трэба ўраўноўваць адносіны персанажаў і адносіны акцёраў. Калі героі кахаюць адно адного, гэта ж не значыць, што такія пачуцці і паміж артыстамі! Гэта наша задача — перадаць іх натуральна. Таму я за шчырасць на сцэне, большы натуралізм. Я не прымаю тэатральны трук: маўляў, калі цалавацца, дык цалавацца недзе ў раёне вушэй. Глядач павінен верыць, што героі сапраўды закаханыя.

— Ты хацела б мужа акцёра?

– Не, акцёры складаныя людзі. Я б хацела бачыць побач з сабой чалавека, які неабыякавы да мастацтва, але непасрэдна з ім не звязаны. Я хацела б, каб мой муж цікавіўся маёй прафесіяй. Яго характар павінен быць мацнейшы за мой. А яшчэ вельмі люблю, калі людзі трымаюць слова. Не можаш нешта зрабіць, дык не абяцай.

— Што не падабаецца ў артыстах?

– Не люблю тых, хто лічыць сябе непрызнаным геніем. Акцёр — гэта характар, лад жыцця, але ж у першую чаргу — гэта прафесія, якая павінна несці праз сябе дабро, запальваць у душах людзей агеньчык светлых пачуццяў. Артысту нельга быць слабым і шукаць сілы ў алкаголі.

Зміцер АРЦЮХ

Фота забяспечана аўтарам

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА IV КВАРТАЛ 2005 ГОДА!

«Літаратура і мастацтва»
Індывідуальная (індэкс — 63856)
на 1 месяц — 3500 руб.
на 3 месяцы — 10500 руб.
Ведамасная (індэкс — 638562)
на 1 месяц — 4800 руб.
на 3 месяцы — 14400 руб.
Льготная (індэкс — 63880)
на 1 месяц — 3800 руб.
на 6 месяцаў — 22800 руб.

"Маладосць"
Індывідуальная (індэкс — 74957)
на 1 месяц — 3600 руб.
на 3 месяцы — 10800 руб.
Ведамасная (індэкс — 749572)
на 1 месяц — 4800 руб.
на 3 месяцы — 14400 руб.
Льготная (індэкс — 00731)
на 1 месяц — 3700 руб.
на 6 месяцаў — 22200 руб.

"Полымя"
Індывідуальная (індэкс — 74985)
на 1 месяц — 3500 руб.
на 3 месяцы — 10500 руб.
Ведамасная (індэкс — 749852)
на 1 месяц — 4500 руб.
на 3 месяцы — 13500 руб.
Льготная (індэкс — 00727)
на 1 месяц — 3700 руб.
на 6 месяцаў — 22200 руб.

"Всемирная литература"
Індывідуальная (індэкс — 74863)
на 2 месяцы — 3800 руб.
на 4 месяцы — 7600 руб.
Ведамасная (індэкс — 748632)
на 2 месяцы — 4800 руб.
на 4 месяцы — 9600 руб.
Льготная (індэкс — 00729)
на 2 месяцы — 4000 руб.
на 6 месяцаў — 12000 руб.

"Нёман"
Індывідуальная (індэкс — 74968)
на 1 месяц — 3500 руб.
на 3 месяцы — 10500 руб.
Ведамасная (індэкс —749682)
на 1 месяц — 4500 руб.
на 3 месяцы — 13500 руб.
Льготная (індэкс — 00728)
на 1 месяц — 3700 руб.
на 6 месяцаў — 22200 руб.

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная рада:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ
Уладзімір ДАВЫДОЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара)
Віктар КАВАЛЁЎ
Янка ЛАЙКОЎ
Інеса ПЕТРУСЕВІЧ
Ірына ШАЎЛЯКОВА
Наталля ЯКАВЕНКА

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220005, Мінск, вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:
галоўны рэдактар — 284-66-73
намеснік галоўнага рэдактара — 284-66-73

АДДЗЕЛЫ:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-81-53
паэзіі, літаратурнага жыцця, крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы — 284-66-73
музыкі, тэатра, кіно і выяўленчага мастацтва — 284-81-53
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: minsk@lim.by

Адрас у Інтэрнеце: www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ". Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку" г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79

Індэкс 63856 Наклад 2904
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 19.10.2005 у 11.00

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Выдавец: Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва"

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 1238

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12